КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 40 (216) ◂ 5 лістапада ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



## ДЗВЕ АНЖАЛІКІ

Стар. 6

### ТРЭЦЯЕ ДЗІЦЁ — НЕПАД'ЁМНАЕ

Матэрыяльныя праблемы адносна добра вырашаюцца ў зусім невялікай колькасці дзетных сем'яў, а астатнім даводзіцца прызвычайвацца да эканамічных абставін, якія існуюць у краіне

Стар. 4

### СТУДЭНТЫ ІДУЦЬ НА ВУЛІЦЫ

Францыю ахапілі пратэсты супраць пенсійнай рэформы, авангардам якіх з'яўляецца студэнцкі прафсаюз (UNEF) і вучні ліцэяў

Стар. 11

### БЕЛАРУСКАМУ «ФАЎСТУ» 305 ГАДОЎ...

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

### ІМЕМ РЭВАЛЮЦЫІ

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ **ЭКСПЕРТЫЗА**

# Віталь Сіліцкі: МЫ ВЫХОДЗІМ НА СУМЕСЬ КІТАЙСКАЙ МАДЭЛІ З НЭПАМ

**Завяршыўся збор подпісаў. Гэты этап палітычнай кампаніі быў нязвыкла мяккім, ліберальным. Паводле інфармацыі Цэнтрвыбаркама, ажно адзінаццаць чалавек падалі неабходныя сто тысяч подпісаў. У апазіцыі нават з'явілася прывідная надзея на выхад з аўтсайдэрскай зоны. Краіну чакаюць змены палітычных элітаў ці трансфармацыя рэжыму? Наколькі трывалы грунт у новастворных палітычных праектаў? На гэтыя пытанні ў размове з Вольгай Хвоін паспрабаваў знайсці адказы кіраўнік Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Віталь Сіліцкі.**




***— У ліпеньскім апытанні сацыялагічнай службы «Baltic Surveys» пры адказе на пытанне «Калі б у бліжэйшы час адбыліся новыя выбары прэзідэнта Беларусі, за каго б вы прагаласавалі?» Аляксандра Лукашэнку назвалі 33% рэспандэнтаў. Пазіцыя не самая моцная.***

— Я не лічу, што 33 працэнты ад агульнага электарату — гэта хісткая пазіцыя. Традыцыйна рэйтынг Лукашэнкі раздзімаўся перад выбарамі. Звычайна тыя, хто не вызначыўся, дзеляцца ў суадносінах тых, што мелі жорсткую пазіцыю да выбараў. Напрыклад, 30% — «за», 10 — «супраць», 50 — не вызначыліся. То гэтыя 50 працэнтаў падзяляюцца ў суадносінах 1 да 3. Калі б пачалі дзейнічаць сур'ёзныя кандыдаты, а настрой тых, хто не вызначыўся, быў нацэлены жорстка супраць дзейнай улады, то гэта б магло выклікаць зрухі. Падобнай сацыяльнай напружанасці, што была ў 1990-я гады, тут няма. Таксама трэба памятаць, што выбарчая драматургія залежыць не столькі ад унутраных, колькі ад знешніх фактараў. Пасля таго, як стала відавочна, што з Расіяй дамовіцца немагчыма, вырашылі трымаць курс на Захад. Цяпер мы назіраем пераход ад тактыкі наўпроставага і прымітыўнага ўздзеяння на апанентаў да карнавальнага аўтарытарызму. Ствараецца бачнасць нейкай «дзвіжухі», драматургіі і, адпаведна, выбарчага працэсу. Канешне, гэта гульня небяспечная, бо заўжды можа пайсці не па правілах. Напрыклад, праз пяць, дзесяць, пятнаццаць гадоў гэта можа выстраліць, можа з'явіцца рэальная, непрадказальная, эфектыўная апазіцыя. Але цяпер такога не маем, таму нішто не перашкаджае ўладам пагуляцца.

***— Хто ж цяпер з'яўляецца электаратам Аляксандра Лукашэнкі?***

— Ён захаваў пенсіянераў, гэта галоўнае. За яго галасуюць рабочыя і сяляне. Крышку больш, чым раней, за яго гатовыя галасаваць эліты. Гэта маўклівая большасць. У Амерыцы ў 1960 гадах было многа пратэстаў, а людзі выбіралі кансерватараў, бо была маўклівая большасць, якая і вырашала лёс краіны.

***— Цяпер падаецца, што апазіцыя мае шанец. Ці ёсць пад гэтымі спадзяваннямі грунт?***

— Апазіцыі далі выйсці у вызначаным накірунку. Пры аслабленым кантролі за зборам подпісаў сабраць сто тысяч подпісаў можа любы. Што па сутнасці і адбылося. Але гэта зраўняла палітычны капітал і Някляева, і Саннікава, і Правальскага. Яны гуляюць па правілах улады. Ствараецца не структураванае палітычнае поле, а пясочніца. І мне цікава, якім канкрэтным мэсіджам, праграмай у такім гармідары будзе складана. На падліку подпісаў усё застанецца па-старому. І мне цікава, якім чынам улады размяркуюць пазіцыі — хто будзе другім, трэцім, чацвёртым... Цяпер улады маюць патрэбу раздзьмуць палітычную вагу бяспечных «карлікаў». І вось гэтыя «надзьмутыя» будуць нароўні з тымі, хто насамрэч працаваў. А наша апазіцыя не задумваецца пра такую тактыку.

У камандах ёсць эйфарыя, адчуванне свабоды. У большасці на кандыдатаў працуюць маладыя людзі, якія не маюць вялікага досведу палітычных кампаній, не могуць параўнаць сітуацыі. Зараз мы маем сцэнар падзей, які падобны да 2001 года.

Інерцыя натхнення дацягне да нейкага дзеяння ў дзень і пасля выбараў. Але потым непазбежна прыйдзе чарга задумацца: пакарнавалілі, і што далей? Пачнецца нудны міжвыбарчы перыяд, які прыносіць крызіс фірмам-аднадзёнкам.

***— У Беларусі з'явілася плеяда новых палітыкаў-кандыдатаў, але нават прозвішчы іх не кожны назаве. Ці ёсць верагоднасць у такіх умовах з'яўлення «адзінага» кандыдата?***

— Адзіны з'явіўся б тады, калі б быў жорсткі кантроль на стадыі збору подпісаў. Больш за два чалавекі і зараз не сабралі б сто тысяч подпісаў. Магчыма, гэта былі б Саннікаў, Някляеў і Раманчук ці Кастусёў, якія маюць палітычныя структуры. Тады магла б выкрышталізавацца некантралюемая сапраўдная апазіцыя. Думаю, ёй бы сталі Саннікаў і Някляеў з раскладам, які быў паміж Мілінкевічам і Казуліным.

***— Калі б Аляксандр Мілінкевіч і Аляксандр Казулін уваліся ў цяперашнюю кампанію, ці б выглядалі на галаву вышэй усіх кандыдатаў, ці іх час мінуў?***

— Мілінкевіч і Казулін застаюцца самымі папулярнымі палітыкамі. Калі пасля выбараў яны захаваюць гэтыя пазіцыі, то будзе доказ таго, што ўся цяперашняя валтузня — усяго толькі пшык. Палітыка — гэта не толькі рэйтынг, але і рэсурсы. Рэсурсаў абодва былі пазбаўленыя.

**Працяг на стар. 4** ▸

ФОРУМ

# ЕЎРАПЕЙСКІ ВЭКСАЛЬ



Photo.ByMedia.Net

Вольга ХВОІН

**Улады Беларусі маюць намер працягваць «планамерны рух у бок мадэрнізацыі, дэмакратызацыі краіны». «Іншы варыянт развіцця Беларусі немагчымы», — заявіў падчас адкрыцця XIII Мінскага форуму кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей.**

Ён зазначыў, што краіна чакае ад Еўрапейскага саюза адпаведнай рэакцыі: спрашчэння візавага рэжыму, поўнай адмены санкцый, лібералізацыі эканамічных адносінаў. Макей сказаў, што лічыць непрадуктыўным ціск на Беларусь. Увогуле, рыторыка Уладзіміра Макея кардынальна змянілася ў параўнанні з мінулым годам. Тады галоўным пасылам была дэманстрацыя незалежнасці Беларусі ад якіх бы тое ні было палітычных патрабаванняў суседзяў. Цяпер артыкулявалася, што дзяржава ўжо стаіць на шляху пераменаў і вітае намеры ЕС развіваць адносіны.

Палітолаг Алесь Лагвінец гаворыць, што «дыялог паміж Беларуссю і ЕС ідзе». «Часам ён нагадвае дыялог глухіх і сляпых, бо бакі не разумеюць, чаго яны хочуць, не заўсёды публічна гаворыцца пра існуючыя праблемы. Але ўлады краіны вымушаныя лічыцца з меркаваннем Еўрасаюза, і таму мы бачылі ліберальныя адносіны хаця б на этапе збору подпісаў па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты. Пазітыўна, што нядаўна ў Беларусь прыязджаў Еўрапейскі камісар па пытаннях аховы здароўя і абароны правоў спажыўцоў Джон Далі. Падобныя кантакты спрыяюць выхаду з ізаляцыі, Беларусь ужо не можа быць такой, як была раней», — зазначае эксперт.

Кіраўнік ведамства федэральнага канцлера Германіі федэральны міністр па асаблівых даручэннях Рональд Пафала пацвердзіў, што Еўрасаюз мае намер пашырыць кантакты з Беларуссю. «Мы зацікаўленыя ў пазітыўным развіцці суверэннай Беларусі, і супрацоўніцтва з ЕС пайшло б гэтаму на карысць. Супрацоўніцтва ўжо вядзецца на высокім узроўні, і мы хацелі б яго працягнуць, — сказаў Пафала. Разам з тым федэральны міністр Германіі зазначыў, што падаўжэнне мараторыю на санкцыі для Беларусі з'яўляецца «вэксалем на будучыню, які дзяржава яшчэ не аплаціла». Еўропа незадаволеная тым, што ў Беларусі застаецца нявырашаным пытанне аб смяротнай кары. «Вынясенне трох смяротных прысудаў і выкананне двух на працягу гэтага года паказвае, што Беларусь папросту грэбліва ставіцца да патрабаванняў Еўрасаюза». Прэзідэнцкія выбары Пофала назваў «пробным каменем, па якім будзе вымярацца выкананне Беларуссю чаканняў ЕС». Па словах Пофалы, дыялог магчымы толькі ў выпадку, калі бакі кіруюцца агульнапрынятымі дэмакратычнымі каштоўнасцямі Еўропы.

XIII Мінскі форум «Беларусь і ЕС пасля крызісу: выклікі і шансы ў сферах палітыкі, эканомікі і грамадства» праходзіў у Мінску 3–4 лістапада. Мерапрыемства арганізавана Нямецка-беларускім таварыствам, з'яўляецца пляцоўкай для дыскусій прадстаўнікоў дзяржавы і грамадскасці па пытаннях эканомікі, палітыкі, культуры.

МАНІТОРЫНГ

# ЗАМБАВАННЕ НА «ПРАВІЛЬНЫ» ВЫНІК

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Альтэрнатыўныя Лукашэнку патэнцыйныя кандыдаты ігнаруюцца або рэпрэзентуюцца адмоўна. Галоўным акцёрам у дзяржаўных медыя з'яўляецца дзеючы прэзідэнт, які ацэньваецца выключна станоўча. Такія вынікі першага маніторынгу асвятлення выбараў у СМІ, агучаныя Беларускай асацыяцыяй журналістаў.**

«Апазіцыя ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі звычайна асвятляецца як дэперсаналізаваны суб'ект. Ніякіх прозвішчаў, а папросту «апазіцыя» ў трэцяй асобе. Пра патэнцыйных кандыдатаў і сам працэс збору подпісаў практычна нічога не паведамляецца», — адзначыў сябра Рады БАЖ Алесь Анціпенка.

Маніторынг, які ладзіць БАЖ, распачаты з 25 верасня і будзе доўжыцца да 30 снежня. Першы яго этап ахапіў перыяд збору подпісаў за прэтэндэнтаў у прэзідэнты. Аб'ектамі маніторынгу з'яўляюцца 17 сродкаў масавай інфармацыі. Яны рэпрэзентуюць як агульнанацыянальныя, так і рэгіянальныя медыя. Гэта і дзяржаўныя, і недзяржаўныя СМІ: друкаваныя выданні, радыё і тэлевізійныя праграмы, а таксама два інтэрнэт-рэсурса — naviny.by і belta.by.

Паводле маніторынгу, тэма прэзідэнцкіх выбараў за гэты перыяд у дзяржаўных СМІ не была прыярытэтнай. Ёй адводзілася часу ў два ці тры разы меней за сюжэты, прысвечаныя надвор'ю. Так, у навінлай праграме «Панарама» (Першы нацыянальны канал) выбарчы працэс заняў 0,86% часу, надвор'е — 3,45%, спорт — 17,4%. Прэзідэнту адвялі 75% часу (параўнальна з усімі іншымі суб'ектамі маніторынгу), ЦВК амаль 19%, назіральнікам з краін СНД — 6%. І толькі ўзгадалі пра патэнцыйных кандыдатаў Някляева і Правалінскага (менш за 0,06%), а таксама Гайдукевіча (0,1%).

Недзяржаўныя СМІ, як паведаміў спадар Анціпенка, больш актыўна цікавяцца выбарамі. Яны падалі даволі шырокае кола суб'ектаў. Рэкардсменам з'яўляецца інтэрнэт-газета naviny.by, якая рэпрэзентавала 40 суб'ектаў выбарчага працэсу. Галоўнымі асобамі гэтага перыяду сталі якраз патэнцыйныя кандыдаты, а таксама ЦВК і некаторыя палітычныя партыі і рухі. Пры гэтым патэнцыйныя кандыдаты ў інтэрнэт-выданні ацэньваліся досыць збалансавана — як нейтральна, так часам і пазітыўна ці адмоўна.

Алесь Анціпенка звярнуў увагу на асаблівасць сёлетняй прэзідэнцкай кампаніі ў параўнанні з 2006 годам. «Цягам усяго гэтага перыяду і асабліва ў заключнай яго частцы шэраг дзяржаўных медыя апублікавалі матэрыялы, якія ствараюць уражанне перадвызначанасці вынікаў гэтай кампаніі, — сказаў ён. — Гэтага мінулы раз не было. І можна, вядома, здагадвацца, чаму гэта адбываецца. Я выкажу проста гіпотэзу. Напэўна, гэта своеасаблівая рэакцыя на патэнцыйны ўдзел Расіі ў гэтай выбарчай кампаніі. То бок гэта спроба нейтралізаваць уплыў расійскіх медыя».

ЗАЯВА

# ДА СВАБОДНЫХ ВЫБАРАЎ ДАЛЁКА

Вольга ХВОІН

**У Беларусі няма ўмоў, каб правесці свабодныя і справядлівыя выбары, хаця і ёсць пэўны прагрэс у выкананні дэмакратычных нормаў, заявіў кіраўнік ведамства канцлера ФРГ, Федэральны міністр па адмысловых даручэннях Рональд Пафала.**

Федэральны міністр сказаў, што пэўнымі прыкметамі правядзення свабодных выбараў будуць адсутнасць перашкод пры рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты, допуск прадстаўнікоў апазіцыі ў склад выбарчых камісій, беспеашкодны допуск назіральнікаў.

Закранаючы тэму вылучэння «адзінага» кандыдата ў прэзідэнты ад апазіцыі, Рональд Пафала сказаў, што не з'яўляецца прыхільнікам таго, каб рабіць палітыкам прапановы, бо гэта будзе выглядаць «як умяшанне ва ўнутраныя справы». «Свабодныя выбары не азначаюць, што вылучаюцца два кандыдата: дзейны прэзідэнт і альтэрнатыўны кандыдат. Для апазіцыі было б немэтазгодна вылучаць аднаго кандыдата. Увогуле, свабодныя выбары — гэта вялікая колькасць кандыдатаў, плюралізм. Іншая справа, ці змогуць апазіцыйныя кандыдаты дамовіцца пра сумесную платформу і сфармаваць адзіныя патрабаванні», — зазначыў спадар Пафала.

Адказваючы на пытанне, якая супрацьвага эканамічным стымулам будзе ў Еўрасаюза ў адносінах да Беларусі, Пафала сказаў, што калі выбары не будуць прызнаныя, то асабіста ён будзе крытыкаваць Беларусь і мае намер у наступным годзе прыехаць у Мінск, каб абмеркаваць выбары. «Я цесна звязаны з Беларуссю, і не маю намеру спыняць свае кантакты. Я бачу, што ідуць працэсы развіцця ў апазіцыі, грамадзянскай супольнасці. Таму я перакананы, што і надалей варта інтэнсіфікаваць кантакты з Еўропай», — зазначыў федэральны міністр.

Таксама кіраўнік ведамства канцлера ФРГ, федэральны міністр па адмысловых даручэннях Рональд Пафала сказаў, што цяпер найвялікшай перашкодай да супрацоўніцтва з Еўропай ёсць практыка прымянення ў Беларусі смяротнай кары. «У ЗША прымяняецца смяротная кара. Я ўдзельнічаў у ЗША ў дыскусіях на гэтую тэму і не падтрымліваю такі від пакарання. Але яны не хочуць стаць сябрам Савета Еўропы», — сказаў федэральны міністр.

ТРАГЕДЫЯ

# ПРА СПАЧУВАННЕ, ЖАЛОБУ І ПРАГМАТЫЗМ

**Нарэшце і Аляксандр Лукашэнка адрэагаваў на пінскую трагедыю. 3 лістапада кіраўнік дзяржавы выказаў спачуванне родным і блізкім пацярпелых працаўнікоў «Пінскдрэў ДСП».**

«Трагедыя, якая знесла жыцці блізкіх вам людзей, патрэсла ўсіх грамадзян Беларусі. Гэта не толькі ваша асабістае гора, а наша агульная бяда і сур'ёзны ўрок на будучыню… Мы прыкладзем максімальныя высілкі, каб больш не дапусціць такога ў нашай краіне», — гаворыцца ў спачуванні.

Між тым, гэта ўжо не першы трагічны выпадак на пінскім прадпрыемстве. Жыхары горада ўзгадваюць, што ўстаноўка «Цыклон», якая стаіць на пінскай фабрыцы, ужо выбухала гадоў 5 таму. Тады загінуў 1 чалавек. Акрамя таго, работнікі кажуць, што некалькі разоў звярталіся да кіраўніцтва з пытаннямі пра бяспеку працы. Яны падазравалі, што ў паветры вялікая канцэнтрацыя драўлянага пылу. Аднак супрацоўнікі лабараторыі казалі, што ўсе паказчыкі ў норме.

Жыхары дамоў, якія знаходзяцца побач з фабрыкай, некалькі разоў ужо звярталіся ў санэпідэмстанцыю, да дэпутатаў, у мясцовую прэсу з пытаннямі пра стан экалогіі ў раёне прадпрыемства. Аднак яны заўжды атрымлівалі адказ, што паказчыкі забруджвання паветра ў норме. Людзі лічаць, што ніхто не можа даць рады «Пінскдрэву», бо гэта горадаўтваральнае прадпрыемства, а дырэктар холдынгу вельмі ўплывовая асоба — нават на рэспубліканскім узроўні.

Дарэчы, Беларуская партыя «Зялёныя» заклікала правесці праверку небяспечных прадпрыемстваў, каб у будучыні пазбегнуць падобных выпадкаў. Аднак пакуль ніякай рэакцыі на зварот эколагаў няма.

Як і няма рэакцыі на прапанову лідэра Руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча абвясціць нацыянальную жалобу. «Жыццё і бяспека нашых людзей ёсць галоўнай каштоўнасцю для дзяржавы, і таму аніякія палітычныя разлікі не апраўдваюць замоўчванне, чэрствасць ды брак чалавечай спагады з боку ўладаў», — падкрэсліваецца ў лісце лідэра Руху «За Свабоду». Жалобу вырашылі абвясціць толькі ў Брэсцкай вобласці.

Тым часам іншыя работнікі «Пінскдрэву» лічаць, што здарэнне можа прывесці да змяншэння іх заробкаў. Яны мяркуюць, што кіраўніцтва фабрыкі цяпер скіруе шмат сродкаў на аднаўленне вытворчасці ДСП. Гэта вытворчасць была адной са стабільных крыніц паступлення валюты на прадпрыемства. Львіная частка пліт паставілялася ў краіны Еўрасаюза. Таму цэх, дзе адбыўся выбух, працаваў у тры змены. Да таго ж, як апасаюцца работнікі, грошы на выплаты (згодна рашэнню Савета дырэктараў прадпрыемства, 50 мільёнаў — пацярпелым і 100 — сем'ям загінулых) таксама возьмуць з іх кішэняў. Вось такі прагматызм…

Але ніякія грошы не змогуць кампенсаваць страту блізкага чалавека. Нагадаем, у выніку трагедыі загінулі 14 чалавек. Старэйшаму з іх было 60 гадоў, самаму малодшаму — толькі 23.

**Рэдакцыя «НЧ» выказвае шчырыя спачуванні сем'ям загінулых. Светлая ім памяць…**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ДАВЕРЛІВЫЯ І НАІЎНЫЯ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Чым больш жыву, тым больш здзіўляюся даверлівасці і наіўнасці еўрапейскіх чыноўнікаў. Здаецца мне, яны рэгулярна наступаюць на адны і тыя ж граблі ў адносінах з Беларуссю, і робяць тое, што ніколі б не зрабілі ва ўласным жыцці. Прыкладам, пазычылі вы камусьці грошы, а чалавек вам не толькі іх не аддае, дый не мае намеру аддаваць, але і просіць яшчэ. Пазычыце яму яшчэ раз? Наўрад ці. Але гэта еўрапейцаў не тычыцца.**

У Мінску сустрэчу з міністрамі замежных спраў ФРГ і Польшчы Гіда Вестэрвеле і Радаславам Сікорскім правеў Аляксандр Лукашэнка. На ёй ён у чарговы раз заявіў, што цяперашнія выбары пройдуць «яшчэ больш адкрыта і дэмакратычна, чым усе папярэднія».

«Ніколі ў нашай краіне не было, каб парламент і прэзідэнта выбіралі недэмакратычна, — запэўніў ён. — Гэтыя выбары будуць дэмакратычнымі, таму што вы гэтага хочаце. Калі Еўропа паставіла пад сумненне нашы выбары, то я ўжо адкрыта сказаў: заплюшчыце вочы на ўсе парушэнні з боку апазіцыі, а пасля выбараў я вам усё раскажу».

Паводле слоў Лукашэнкі, Германія і Польшча робяць вельмі шмат для таго, каб былі добрыя адносіны як у Беларусі з гэтымі краінамі, так і ў Беларусі з Еўрасаюзам.

«Патэнцыял нашых магчымасцяў велізарны, але нерэалізаваных магчымасцяў у нас значна больш», — пераканаты прэзідэнт. «І тыя крокі, якія робіцца Еўрасаюзам, напрыклад санкцыі і іншыя абмежаванні, не спрыяюць паляпшэнню адносін», — дадаў ён.

Лукашэнку таксама турбуе, што ініцыятыва ЕС «Усходняе партнёрства» «топчацца на месцы». «Было шмат надзей, але пакуль яны не рэалізаваныя. У нас ёсць што прапанаваць Еўрасаюзу, і спадзяюся, што сённяшняя сустрэча актывізуе нашы адносіны», — заявіў прэзідэнт.

У сваю чаргу, Сікорскі адзначыў: Польшча, як сусед Беларусі і сябар ЕС, зацікаўлена ў тым, каб Беларусь «прытрымлівалася еўрапейскіх каштоўнасцяў». Паводле яго слоў, Польшча падтрымлівае такія мэты і задачы «Усходняга партнёрства», як эканамічная інтэграцыя і спрашчэнне візавага рэжыму. У якасці прыкладу ён паведаміў, што Малдова неўзабаве атрымае 2 мільярда еўра ў межах «Усходняга партнёрства».

«Прэзідэнт Беларусі нам клятвенна абяцаў, што выбары будуць сумленнымі, а правы нацыянальных меншасцяў у Беларусі будуць захоўвацца. Мы будзем лавіць яго на слове», — дадаў ён.

Ну, злавіў Сікорскі на слове, і што? Пакуль што Лукашэнка сам гаспадар свайго слова: захацеў — даў, захацеў — забраў. Свабодных і дэмакратычных выбараў яшчэ не назіраецца. Праблемы з Саюзам палякаў дагэтуль не вырашаныя. Але аванс Лукашэнку ўжо выдадзены. І які аванс!

Міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі адклікаў сваё вета на магчымасць удзелу Беларусі ў праграме Еўрасаюза «Паўночнае вымярэнне». Сікорскі падкрэсліў, што гэта палітычнае рашэнне, якое «будзе мець і фінансавыя наступствы». Ён адзначыў, што зараз у Беларусі ёсць «унікальны шанец»: у выпадку правядзення справядлівых выбараў краіна зможа «выкарыстаць усе перавагі добрых адносін з Еўрасаюзам». «Падкрэслю, што я кажу пра якасць выбараў, а не пра іх вынік, таму што вынік выбараў — гэта рашэнне беларускага народа», — сказаў кіраўнік польскага МЗС.

Ну, як дзеці… Абяцанка — цацанка, а дурню радасць.

А між тым, апазіцыя ўжо зараз цвердзіць пра непразрыстасць выбарчай кампаніі. Кампанія «За справядлівыя выбары», якую праводзяць больш як дзесяць апазіцыйных палітычных партый і грамадскіх арганізацый, вылучыла ва ўчастковыя камісіі больш як 1100 сваіх прадстаўнікоў. Як заявіў адзін з каардынатараў кампаніі лідэр Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін, гаварыць пра выніке фарміравання камісій пакуль рана. «Паводле папярэдніх звестак, у Мінску ў склад участковых камісій уключана 30–40 нашых прадстаўнікоў, у Магілёве — ні аднаго. Але агульная тэндэнцыя такая, што ва ўчастковыя камісіі наўрад ці трапяць больш як 15% нашых прадстаўнікоў», — сказаў Калякін.

Ён упэўнены, што ўлады не зацікаўлены ў правядзенні празрыстых і свабодных выбараў. «Як правіла, у камісіі ўключаюць апазіцыйных прадстаўнікоў, якія не маюць вялікага вопыту ўдзелу ў выбарчых кампаніях. І, наадварот, людзей з вялікім вопытам, юрыдычнай адукацыяй не ўключаюць», — заўважыў палітык.

Тое ж кажуць і прадстаўнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». У Мазыры ў камісіі трапілі толькі 4 апазіцыянера. Фарміраванне ўчастковых камісій па Гродзенскім раёне (усяго іх 40) на пасяджэнні райвыканкаму заняло толькі 7 хвілін. Па ўжо звыклай завядзёнцы, спісы персанальнага складу не зачытваліся, а прапанаваныя кандыдатуры не абмяркоўваліся. Ва ўсіх 40 участковых камісіях Гродзенскага раёна будуць працаваць толькі «надзейныя кадры». На пасяджэнні выканкама адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля 2 лістапада былі ўтвораны ўчастковыя камісіі. Пасяджэнне доўжылася 14 хвілін, за якія і была сфарміравана 51 участковая камісія. Збольшага, зноў жа — «правераныя кадры».

І ў той жа час у Мінску пачала працу аглядная місія Міжнароднага валютнага фонду (МВФ). Эксперты будуць знаходзіцца ў Беларусі да 16 лістапада.

Як паведамілі ў прадстаўніцтве МВФ у Мінску, гэта штогадовая місія, мэты якой заключаюцца ў аглядзе эканамічнай палітыкі за мінулы год і абмеркаванні з уладамі палітыкі на наступны год і сярэднетэрміновую перспектыву. Бакі абмяркуюць пытанні грашова-крэдытнай, падаткова-бюджэтнай палітыкі і палітыкі валютнага курсу. Апрача таго, будуць разглежаны пытанні структурных пераўтварэнняў і планы ўлад адносна структурных пераўтварэнняў на найбліжэйшыя тры-пяць гадоў.

Пры гэтым у прадстаўніцтве МВФ зазначаюць, што пытанне наконт новай праграме крэдытавання stand-by падчас працы місіі абмяркоўваць не плануецца.

Нагадаем, у 2009–2010 гадах Беларусь атрымала пяць траншаў крэдыту МВФ па праграме stand-by. Агульная сума сродкаў, выдзеленых фондам у межах стабілізацыйнай праграмы, склала прыкладна 3,46 мільярда долараў.

> Прапанаваныя кандыдатуры не абмяркоўваліся. Ва ўсіх 40 участковых камісіях Гродзенскага раёна будуць працаваць толькі «надзейныя кадры»

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ЛАРАН АРЫНІЧ



Адмоўным героем тыдня стаў генеральны дырэктар холдынгу «Пінскдрэў» Ларан Арыніч. З-за выбуху на прадпрыемстве загінулі 14 чалавек, шэсць чалавек знаходзяцца ў шпіталях краіны ў цяжкім стане. Гэта трагедыя абляцела ўсю Беларусь, Пінск ужо другі тыдзень жыве перажываннямі пра надзвычайнае здарэнне, якое забрала жыцці людзей. Але ні кіраўніцтва дзяржавы, ні кіраўніцтва прадпрыемства не заявілі пра абвяшчэнне жалобы. Жалобу па ахвярах аб'явілі толькі 3 і 4 лістапада на Брэстчыне па распараджэнні губернатара вобласці Канстанціна Сумара.

Спачатку кіраўніцтва «Пінскдрэва» сказала, што выплаціць сем'ям загінулых па дзесяць мільёнаў беларускіх рублёў, затым гэтая сума была ўрэзаная да трох мільёнаў рублёў. У людзей такая «кампенсацыя» хутчэй выклікала асацыяцыі са здзекам, а не з дапамогай. Праз тыдзень было аб'яўлена, што сем'ям загінулых выплацяць па 100 мільёнаў рублёў, пацярпелым — па 50 мільёнаў рублёў.

Генеральнага дырэктара холдынгу «Пінскдрэў» Ларана Арыніча называюць адным з найбольш паспяховых топ-менеджэраў сучаснай Беларусі. Ён атрымліваў з рук прэзідэнта краіны Ордэн Пашаны, з'яўляецца ганаровым грамадзянінам горада Пінска, заслужаным работнікам прамысловасці Беларусі, лаўрэатам конкурсу «Чалавек Справы–2008» у намінацыі «За стабільную і эфектыўную працу на беларускім і замежным рынку». Але такая колькасць заслуг і рэгалій не паўплывала на адносіны да калектыву працоўных і да трагедыі. Інфармацыя пра выбух замоўчваецца, журналістаў не пускаюць на месца здарэння.

Пажар на заводзе «Пінскдрэў» адбыўся 25 кастрычніка. Пракуратура Брэсцкай вобласці завяла крымінальную справу за парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны і бяспекі. Пры Савеце бяспекі створана камісія па расследаванні абставінаў здарэння, якая 15 лістапада мусіць зрабіць даклад аб выніках расследавання. Акрамя таго, уласную камісію па расследаванні прычынаў трагедыі стварыла кіраўніцтва кампаніі «Пінскдрэў».

### БЕРНД ШТАНГЕ



Галоўны трэнер зборнай Беларусі Бернд Штанге прызнаўся, што яму сорамна за галоўны стадыён краіны «Дынама». «Наш нацыянальны стадыён — гэта папросту катастрофа! Я не мусіў бы пра гэта гаварыць, таму што мне ўжо паабяцалі новы стадыён у хуткім часе. Але я хачу пастаянна пра гэта нагадваць дзеля нашых заўзятараў. Любому фанату патрэбны добры сэрвіс. Калі гульня праходзіць кастрычніцкім вечарам, усе заўзятары мокнуць пад дажджом, але ім няма дзе купіць кубак гарбаты. Прыбіральню не знайсці. Я б са сваёй сям'ёй не пайшоў на такі стадыён. А гэты ж твар нашай краіны! Усе мае знаёмыя знакамітыя трэнеры, напрыклад Гус Хідзінк, любуюцца і захапляюцца Мінскам. Але ў той жа час жахаюцца нашым стадыёнам. Гэта ганьба! — цытуе Штанге «Народная газета». — Я па-ранейшаму мару аб радыёканферэнцыях, калі заўзятары ў любы момант змогуць паслухаць прамыя ўключэнні з матчаў, што праходзяць у Барысаве, Брэсце, Гродна і іншых гарадах. І чаму футбол па тэлебачанні не паказваюць у прайм-тайм? Агляды матчаў можна паглядзець у панядзелак позна ўвечары, калі дзеці ўжо спяць. Наадварот, моладзь трэба прывучаць да футбола».

### СЯРГЕЙ РЫЖОЎ



Патэнцыйныя кандыдаты на пасаду прэзідэнта выходзяць з перадвыбарчай гонкі, як негрыцяняты ў вядомай лічылцы. Пасля працэдуры здачы подпісаў за вылучэнне ў кандыдаты на палітычнай дыстанцыі засталося 11 чалавек з 19.

Былы прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Сяргей Рыжоў, які працаваў начальнікам знешнеэканамічнага сектара Віцебскага садавінна-гароднінная камбіната «Ноўка», заявіў, што яго незаконна звольнілі з працы з прычыны прагулу. У якасці прагула разглядаецца дзень, калі ён быў спачатку ў паліклініцы, а затым — у судзе. Але дакументы, якія пацвярджаюць гэты факт, кіраўніцтва камбіната да ўвагі не прыняло.

«Разглядаецца сітуацыя па 4 кастрычніка, калі я быў вымушаны выклікаць участковага лекара ў сувязі з абвастрэннем хранічнага захворвання. Таксама ў мяне была павестка ў абласны суд, дзе разглядалася мая скарга па факце адмовы ў рэгістрацыі Левінава Паўла ў якасці прадстаўніка ў тэрытарыяльнай выбарчай камісіі. Кіраўніцтву былі прадстаўлены ўсе неабходныя дакументы па гэтых фактах, пазапраўна выдадзены загад пра маё звальненне», — сказаў Рыжоў у інтэрв'ю «Еўрарадыё».

Сяргей Рыжоў заявіў, што не збіраецца спакойна падпарадкоўвацца загаду кіраўніцтва камбіната і будзе абскарджваць загад аб сваім звальненні праз суд. Хаця, па яго словах, і не верыць у беларускае правасуддзе.

▸ ЭКСПЕРТЫЗА

# Віталь Сіліцкі: МЫ ВЫХОДЗІМ НА СУМЕСЬ КІТАЙСКАЙ МАДЭЛІ З НЭПАМ

◂ Працяг.
Пачатак на стар. 1.

Сыход Аляксандра Казуліна з публічнай палітыкі можна зразумець у кантэксце абставін, праз якія ён прайшоў. Аляксандр Мілінкевіч зрабіў вялікую памылку — ён не паверыў, што людзі гатовыя на яго працаваць без рэсурсаў, а яны былі гатовыя. Калі б Мілінкевіч удзельнічаў у выбарах, то іх драматургія была б іншай. Яго фігура не дазваляла б раздзьмувацца Саннікаву і Някляеву. Зауважце, да верасня апазіцыйныя кандыдаты так ці інакш пазіцыянавалі сябе як адрозных ад Мілінкевіча. Потым ён знік, і некаторыя палітыкі сутыкнуліся з крызісам жанру — як сябе прадстаўляць, каму супрацьпастаўляць.

***— Чаго тэхналагічна не хапае цяперашнім патэнцыйным кандыдатам у прэзідэнты?***

— Вялікае дасягненне гэтай кампаніі — вяртанне публічнай палітыкі. Калі на пікетах, сустрэчах людзі могуць адкрыта размаўляць пра палітыку. Выкарыстоўваюцца новыя інструменты працы, спосабы прыцягнуць увагу. Гэтым збольшага займаецца адзін чалавек, а астатнія папросту не маюць грошай на паслугі паліттэхнолагаў. Разам з тым трэба зазначыць, што Уладзімір Някляеў не падрыхтаваны да палітычнай, публічнай дзейнасці. Кожны яго выступ — гэта PR-катастрофа, якую каманда пасля мусіць разрульваць. Або з кандыдатам не працуюць, або людзі ў яго некампетэнтныя, або кандыдат некантралюемы... Увогуле, палітычная структура ў Беларусі — гэта сеціва, тусоўкі знаёмых. Прафесійныя і напаўпрафесійныя рэвалюцыянеры. У гэтых сеціваў людзі знаходзяцца па 15–20 гадоў і пераліваюцца з аднаго праекту ў другі.

***— Феномен гэтай кампаніі — партыя БНФ. Яе сябры збіралі подпісы за свайго кандыдата за ідэю, а не за грошы. Магчыма, нашым паліструктурам трэба імкнуцца да такой мадэлі працы?***

— Яны малайцы. Палітычнае поле фарматуецца пад фірмы-аднадзёнкі. Для партый БНФ і АГП гэта кампанія была шанцам даказаць, што партыі маюць права на існаванне. Бо, з іншага боку, выглядае на тое, што партыі не патрэбныя, калі ёсць рынак, дзе набываюцца людзі і медыя. Попыт на падобныя палітычныя праекты створаны знізу. Калі патрэбныя рэсурсы, то загадзя вядома, да каго звяртацца. У партыях застаюцца ідэйныя, прынцыповыя людзі. Але іх няшмат, і збольшага яны са старэйшага пакалення.

***— Каго б з кандыдатаў вы назвалі найбольш моцным супернікам Лукашэнкі?***

— У цяперашніх умовах найбольш моцны той, хто мае добры PR-праект. Пакуль гэта Андрэй Саннікаў. Чаму не Някляеў, я тлумачыў раней. Але не выключаю і таго, што «стрэліць» могуць, скажам, Яраслаў Раманчук ці Алесь Міхалевіч — яны добра артыкулююць свае думкі, нядрэнна падрыхтаваныя, маюць пэўную харызму, умеюць камунікаваць з людзьмі. Увогуле, складана прадказаць, каго захоча народ. У 1993 годзе ніхто не мог падумаць, што Аляксандр Лукашэнка — той чалавек, якога чакае Беларусь. Цяпер усё ж ёсць патрэба ў новых тварах, новым палітычным почырку. Някляеў і Саннікаў моцна падобныя на традыцыйныя вобразы інтэлігентнага беларуса. «Стрэляць» не тыя, хто мае намер пераманіць да сябе прыхільнікаў Лукашэнкі, бо гэта немагчыма, а тыя, хто прапануе прывабную альтэрнатыву тым, хто хістаецца. Часткова гэта зрабіў у 2006 годзе Мілінкевіч, ён гуляў на кантрасце, але ўзніклі праблемы з палітычным менеджментам. Патрэбны чалавек бескампрамісна новы. Смелыя эксперыменты цяпер вельмі дарэчы.

***— Ці магчыма будаваць палітычную краіну без аглядкі на Расію?***

— Усе кандыдаты так ці інакш імкнуцца прыцягнуць увагу Расіі. У Беларусі дзейнічаць на палітычным полі без аглядкі на ўсходнюю суседку немагчыма. Стаўленне можа быць любым, але не ігнараваннем.

***— Савет Еўропы зноў заявіў пра сваю гатоўнасць да паглыблення адносін з Беларуссю. Тактыка замарожвання санкцый працягнутая. У краіну з афіцыйным візітам прыязджала прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ. Гавораць, што Брусель такім чынам спрабаваў перадаць пасланне Лукашэнку. У перыяд, калі можа вызначыцца лёс краіны, якую пазіцыю заняла Еўропа?***

— Візіт Грыбаўскайтэ выказаў пазіцыю Літвы, а не Еўрасаюза. Беларусь наведаў Сікорскі, яго намеснік спадар Літвін яшчэ два месяцы таму казаў, што Польшча мяняе сваю пазіцыю. «Мы не зацікаўленыя з Беларуссю сябраваць супраць Расіі. Таму Лукашэнку трэба прыслухацца да голасу Еўрасаюза», — вось сэнс новай палітыкі Польшчы. Узровень зацікаўленасці ўсходняй палітыкай рэзка ўпаў. Крызіс расійска-грузінскай вайны пераадолены. ЕС цалкам можа сабе дазволіць паўізаляцыю Беларусі. І пагрозы газавых канфліктаў цяпер намнога меншыя. Пяць гадоў таму кожны чых тут выклікаў паніку. Еўропа з гэтым развіталася.

***— Аляксандр Лукашэнка губляе знешні рэсурс падтрымкі, ужо страчаны інструмент маніпуляцыі. Цяпер варта чакаць самаізаляцыі ці краху рэжыму?***

— Так, поле геапалітычных манеўраў скарацілася. Рэжыму трэба шукаць новыя інструменты ўплыву, новыя мадэлі развіцця, мадэрнізацыі, што дазволіла б захаваць статус-кво. Думаю, мы выходзім на сумесь кітайскай мадэлі з НЭПам. Прыватны бізнес лібералізуецца, ствараецца інвестыцыйны сектар. Каб карміць апарат кіравання, трэба нарасціць долю замежных інвестараў, і над гэтымі праблемамі рэжым будзе біцца цягам бліжэйшых гадоў.

▸ ЖЫЦЦЁ

# ТРЭЦЯЕ ДЗІЦЁ — НЕПАД'ЁМНАЕ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Шмат хто з беларускіх палітыкаў любіць пагаварыць. Асобныя з іх вельмі падобныя да таго героя з «Рэвізора» Гогаля, у якога з кожным словам Цыцэрон з языка злятаў.**


Photo.ByMedia.Net

І чым бліжэй прэзідэнцкія выбары, тым больш становіцца такіх умельцаў. Прыкладам, галоўны прэтэндэнт на першую ў краіне пасаду вельмі хораша выказаў сваю мару аб беларускай жанчыне: «Тое, што Гасподзь наканаваў жанчыне быць маці, бясспрэчна. Якая б кар'ера ні была, вам прыйдзецца займацца выхаваннем сваіх дзяцей. Я хачу, каб наша жанчына нараджала не менш за трое дзяцей».

Прыгожа сказана і неабыякава — з болем пра будучыню краіны.

Але, мусіць, галоўны прэтэндэнт не надта ведае тую краіну, якой кіруе ўжо 16 гадоў.

Дык вось, па звестках Белстата, у структуры малазабяспечаных сем'яў асноўную частку (67,9%) складаюць хатнія гаспадаркі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў.

У сярэднім дзетныя сем'і маюць горшы матэрыяльны стан, чым астатнія. Зразумела, што лозунг «усё лепшае дзецям!» у дзяржаўнай рыторыцы мае прапагандысцкі сэнс. Калі, прыкладам, кіраўнік краіны разважае пра грамадскую неабходнасць БРСМ ці піянерскую арганізацыю, у якіх дзеці і моладзь атрымліваюць выхаванне ў лепшых традыцыях мінулых часоў.

Але для большасці бацькоў — гэта паўсядзённае жыццё з яго сапраўднымі і нялёгкімі клопатамі. Ведама ж, што дзецям неабходна якаснае і разнастайнае харчаванне, іх трэба прыгожа абуваць-апранаць, забяспечваць рэчамі і паслугамі, якія гарантуюць іх спартыўнае і культурнае развіццё.

І што атрымліваецца на справе? Як паказалі вынікі выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак спецыялістамі Белстата (праводзяцца рэгулярна штоквартальна), 5,6% ад іх агульнай колькасці ў першым паўгоддзі 2009 года мелі сярэднемесячныя рэсурсы ў памеры да 300 тысяч рублёў. Сярод сем'яў з дзецьмі гэты працэнт удвая вышэй — 10,5%, сярод сем'яў, у якіх двое і болей непаўналетніх дзяцей, амаль утрая — 17,1%.

Прычым тут улічаны не толькі ўсе віды непасрэдна грашовых паступленняў, у тым ліку сацыяльнай дапамогі дзецям, але і ўсіх іншых матэрыяльных прыбыткаў. Прыкладам, калі хатняя гаспадарка мае агарод на лецішчы або вядзе падсобную гаспадарку ў вёсцы, то кошт выгадаванай бульбы з морквай, пералічаны па дзеючых цэнах, заносіцца ў лік грашовых здабыткаў сям'і.

А камунальныя плацяжы, падаткі ды іншыя абавязковыя плацяжы ад агульнай сумы даходаў адымаюцца. Такім чынам, кожная дзетная сям'я мае ў месяц на чалавека не больш за 300 тысяч рублёў — не больш 100 долараў. Мусіць, нікому не трэба тлумачыць, што 100 долараў у месяц на дзіця — гэта не шмат. Калі ж улічыць доларавую інфляцыю апошніх гадоў, то і зусім мала.

І гэта ў сярэднім. Ёсць нямала сем'яў, чые даходы з улікам дапамогі дзяржавы ледзьве дацягваюць узроўню пражытачнага мінімуму, гэта значыць знаходзяцца на мяжы беднасці.

Наступная шкала вымярэння дабрабыту хатніх гаспадарак месціцца ў дыяпазоне ад 300 да 500 тысяч рублёў. Такі грошы «на кішэні» маюць 24% усіх беларускіх хатніх гаспадарак. Сярод усіх дзетных сем'яў іх ужо 35,3%, а сярод тых, у каго двое і болей дзяцей — 45,6%.

Вынікі падліку сумныя. Сярод увогуле не багатых беларусаў 29,6% сем'яў грошай на асабістыя выдаткі маюць не болей за 500 тысяч рублёў. Сярод сем'яў, якія выхоўваюць двух і больш дзяцей, гэты працэнт сягае да 62,7. Па сутнасці, такія сем'і ствараюць натуральную рэзервацыю, населеную сацыяльнымі аўтсайдэрамі. Ці лузерамі, як характарызуе бедных людзей расійскі прэзідэнт Мядзведзеў.

«Канстытуцыйная большасць» хатніх гаспадарак — 59,8% ад агульнай колькасці — маюць на душу рэсурсаў да 700 тысяч рублёў штомесяц. З агульнай колькасці дзетных сем'яў да гэтай даходнай нішы (ад 0 да 700 тысяч) належыць 74,3% сямей, у тым ліку з сем'яў з адным дзіцём — 67,8%, з тых, хто мае двое і болей дзяцей — ужо 85,1%!

Да вышэйшай па свабодных рэсурсах групы статыстыка аднесла хатнія гаспадаркі, якія маюць у месяц на душу болей 1 200 тысяч рублёў (каля 400 долараў). Такія грошы «на кішэні» маюць 9,8% усіх сем'яў. Па зразумелых прычынах, «багатых» больш за ўсё сярод хатніх гаспадарак з аднаго чалавека, потым ідуць бяздзетныя — 11,2%, потым сем'і з адным дзіцём — 6,4%, і найменшую вагу «багатых» складаюць сем'і з двума і болей дзяцьмі.

Заўважым, што раней да шматдзетных аднасілі сем'і, у якіх было не менш за чацвёра дзяцей. Зараз нават трохдзетных настолькі мала, што яны не ўлічваюцца статыстыкай.

Такім чынам, можна лічыць, што матэрыяльныя праблемы адносна добра вырашаюцца ў зусім невялікай колькасці дзетных сем'яў, а астатнім даводзіцца прызвычайвацца да вонкавых эканамічных абставін, якія існуюць у краіне. Прыкладам, хатнія гаспадаркі без дзяцей выдаткоўваюць на харчаванне 41,5% сваіх рэсурсаў, а дзетныя сем'і — усяго 37,3%. І наадварот, на нехарчовыя тавары першыя маюць магчымасць расходаваць 32,8%, а сем'і з дзецьмі змушаны выдаткоўваць, у асноўным на адзежу, абутак, школьны рыштунак, 38,4% ад расходнай часткі сямейнага бюджэту.

Калі палітыкі гавораць аб боскай прыналежнасці беларускай жанчыны, яны маюць на ўвазе маральны і адказны выбар. Але жыццё стаіць іх у жорсткія рамкі. Або працуй, не пакладаючы рук, каб забяспечыць матэрыяльна аднаго або двух дзяцей, або нараджай трэцяе і абівай парогі дзяржаўных сацыяльных устаноў.

Пры такіх умовах сама магчымасць маральнага выбару знікае, як снег пад вясеннім сонцам. Бо трэцяе дзіця для сярэдняй сям'і сёння, на жаль, непад'ёмнае.

ВІЗІТ

# ЕЎРА Ў АБМЕН НА ПРЫВІДНУЮ ДЭМАКРАТЫЮ

Вольга ХВОІН

**«У Бруселі еўракамісары мяняюцца, а Лукашэнка застаецца», — гэтымі словамі палітычнага аглядальніка Рамана Якаўлеўскага можна ахарактарызаваць вынік візіту міністраў замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага і Германіі Гіда Вестэрвеле, якія прывезлі з сабою абяцанні фінансавай падтрымкі Беларусі наўзамен правядзення дэмакратычных выбараў, зрухаў у галіне выканання правоў чалавека, дэмакратычных свабодаў.**



Photo.ByMedia.Net

Міністры замежных спраў Германіі Гіда Вестэрвеле, справа, і Польшчы Радаслаў Сікорскі. Прэс-канферэнцыя, г. Мінск, 2 лістапада 2010 года

Дыпламатаў суправаджаў вялікі пул журналістаў з Германіі і Польшчы, відавочна, для Еўрапейскага саюза гэты візіт ладзіўся не дзеля галачкі, а як дэманстратыўная чарговая спроба навесці масты ў адносінах з краінай на ўсходні бок мяжы Еўрапейскага саюза. Праўда, па словах кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Германіі Гіда Вестэрвеле, «мост у Еўропу трымаецца на апорах: дэмакратыі, прававой дзяржаве, правах чалавека, а таксама свабодных і сумленных выбарах». Спадар Вестэрвеле сказаў, што Аляксандр Лукашэнка «асабіста і вельмі ясна выказаўся, што гарантуе правядзенне свабодных і сумленных выбараў», і дадаў, што ацэньваць дзеянні палітыка будуць «не па словах, а па справах».

За гэта ЕС гатовы прадставіць тое, чаго Беларусі цяпер так не хапае, — грошы. «Беларусь ужо атрымала дапамогу ад Міжнароднага валютнага фонду ў той час, калі яго дырэктарам быў польскі прэм'ер Марэк Белька. Сёння я прыняў палітычнае рашэнне, якое будзе мець і фінансавыя наступствы. Я адазваў сваё вета на ўдзел Беларусі ў «Паўночным вымярэнні». Па нашых падліках, Беларусь, калі б былі праведзеныя справядлівыя выбары і яна больш цесна супрацоўнічала з Еўропай, цягам бліжэйшых гадоў атрымала б з розных крыніц каля трох мільярдаў еўра», — раскрыў вясёлкавыя перспектывы ў форме свабодна канвертуемай валюты Радаслаў Сікорскі. Яго калега Гіда Вестэрвеле яшчэ раз падкрэсліў, што падобнае супрацоўніцтва вядзецца «з краінамі, якія развіваюцца па шляху дэмакратыі, свабодных і справядлівых выбараў. У Еўропу вядзе адзіны шлях — праз свабодныя выбары. Гэты пасыл мы выказалі не толькі ўраду, але і грамадзянам», — зазначыў дыпламат.

Партнёрства ЕС «Паўночнае вымярэнне» было заснавана ў 1997 годзе па ініцыятыве Фінляндыі. Яго ўдзельнікамі з'яўляюцца Германія, Польшча, Швецыя, Данія, Ісландыя, Латвія, Літва, Нарвегія, Фінляндыя, Эстонія і Расія. Ініцыятыва накіраваная на развіццё транспамежнага супрацоўніцтва краін-удзельніц, закліканая садзейнічаць пераадоленню цяжкасцяў рэгіянальнага развіцця ў Паўночнай Еўропе. Беларусь не ўваходзіць у праграму, але з'яўляецца партнёрам па развіцці яе асобных кірункаў. Так, у лістападзе 2009 года краіна стала паўнапраўным удзельнікам праектаў партнёрства «Паўночнае вымярэнне» па транспарце і лагістыцы.

Пасланнікі Еўрасаюза шматкроць падкрэслілі, што важная якасць выбараў, а не іх вынік, «бо вынік выбараў мусіць вырашаць беларускі народ». То бок нават калі пераможа Аляксандр Лукашэнка, ЕС яго прызнае як легітымнага прэзідэнта. Паслядоўнасці ў палітычных рашэннях у такім разе не назіраецца.

Нельга сказаць, што дыпламаты былі ў эйфарыі пасля сустрэчы з Лукашэнкам, але прывідныя ілюзіі наконт вырашэння праблемы ўзаемаадносінаў з «апошняй дыктатурай Еўропы», відаць, займелі. Палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі са скептыцызмам глядзіць на вынікі, якіх можна чакаць ад візіту: «Думаю, яны далей будуць меркаваць, што трымаюць Лукашэнку на павадку. Гэта ў Бруселі еўракамісары мяняюцца, а Лукашэнка застаецца. І я хацеў бы нагадаць словы самога Лукашэнкі: «Не важна, што будзе 19 снежня, важна, што будзе пасля».

Радаслаў Сікорскі і Гіда Вестэрвеле таксама сустрэліся з сямю прэтэндэнтамі на пасаду прэзідэнта ад апазіцыі і Аляксандрам Мілінкевічам. Пасля гэтай сустрэчы Андрэй Саннікаў і Уладзімір Някляеў прыйшлі да журналістаў, што сабраліся на выніковую прэс-канферэнцыю з дыпламатамі. Што паказвае ці на лідэраў палітычнага забегу, ці на кулуарныя дамовы пра тое, хто такімі лідэрамі будзе прызначаны. Магчыма, канешне, астатнія кандыдаты папросту не змаглі дадумацца да такога кроку.

Лідэр кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў збольшага сустрэчай быў задаволены. «Мы не засталіся зусім адны ў гэтых варунках. Мне не здалося, што для іх пытанне Беларусі не прыкладное, каб вырашыць праблемы з Расіяй. Па інтанацыі, па пасыле спадара Сікорскага падаецца, што ён успрымае гэта і па-чалавечы. Мы найперш прасілі забяспечыць назіранне, дапамагчы нам данесці рэальныя вынікі — колькі людзей прыйдзе, колькі прагаласуе, хто за перамены, а хто за стабільнасць. Яны разумеюць усё, не маюць ілюзій, што гэтая аперэта пачалася і будзе доўжыцца. І яны і мы разумеем, што ўлада непазбежна пойдзе на фальсіфікацыі, і ўся праблема ў тым, як данесці ісціну», — расказаў Някляеў пра тое, якую дапамогу апазіцыя прасіла ў Еўропы.

Палітык Андрэй Саннікаў упэўнены, што, нягледзячы на клятвенныя абяцанні Лукашэнкі, свабодных выбараў не будзе. «Калі б выбары сапраўды мусілі быць дэмакратычнымі, то Ярмошына не ўзначальвала б Цэнтрвыбаркам. Супраць яе ўведзеныя міжнародныя санкцыі за фальсіфікацыі, і напярэдадні выбараў яна заявіла, што з'яўляецца сябрам каманды Лукашэнкі. Значыць, аб'ектыўнасці чакаць нельга», — падкрэсліў Саннікаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# МІНСКІ ФОРУМ: ПАЎТЫСЯЧЫ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

Генадзь КЕСНЕР

**«Беларусь і Еўрасаюз пасля крызісу» — такую назву мае сёлетні Мінскі форум, які ладзіцца ў беларускай сталіцы ўжо трынаццаты раз.**

Па словах арганізатараў, у форуме, які працягнецца тры дні і завершыцца ў пятніцу, 5 лістапада, маюць узяць удзел больш за 450 гасцей з Беларусі, Германіі, іншых краін Еўропы, у тым ліку федэральны міністр ураду ФРГ Рональд Пафала, кіраўнік Адміністрацыі беларускага прэзідэнта Уладзімір Макей, прадстаўнікі бізнесу, палітыкі, грамадскія дзеячы, эканамісты, творчая інтэлігенцыя.

Напярэдадні форуму яго арганізатары распавялі журналістам пра мэты і задачы мерапрыемства і ацанілі абставіны, у якіх яно ладзіцца.

Па словах кіраўніка Мінскага форума прафесара Райнера Лінднера, словазлучэнне ў назве мерапрыемства «пасля крызісу» пакуль яшчэ выглядае спрэчным.

«Ні Германія, ні Беларусь пакуль яшчэ не ведаюць, ці знаходзімся мы ўжо пасля крызісу, тым не менш, ёсць эканамічныя паказчыкі, паказчыкі эканамічнага супрацоўніцтва, у тым ліку і ў гандлі паміж нашымі дзяржавамі, якія сведчаць, што мы ўжо сапраўды расцём у эканамічным плане, — адзначыў Райнер Лінднер. — У гэтым годзе на Мінскім форуме з'явіліся новыя акцэнты, на якіх мы хацелі б засяродзіцца. Беларусь знаходзіцца напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, таму ў нас ёсць магчымасць абмеркаваць дастаткова напружаныя пытанні эканамічнага, палітычнага і грамадскага характару, у тым ліку з прадстаўнікамі палітычнай прасторы, уключна кандыдатаў на пасаду прэзідэнта».

Прафесар Лінднер лічыць, што Беларусь зараз знаходзіцца ў стане эканамічнай пераарыентацыі, у сітуацыі вельмі няпростых стасункаў з Расіяй. «Узаемадачыненні паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам таксама з'яўляюцца вельмі важным чыннікам, важным пытаннем, якое будзе дыскутавацца на гэтым форуме», — падкрэсліў спадар Лінднер.

Кіраўнік Мінскага форума звярнуў увагу на тое, што ўпершыню за час існавання ў ім бярэ ўдзел дзейны федэральны міністр ураду Германіі — у дадзеным выпадку Рональд Пафала, які ў сваім шчыльным працоўным графіку знайшоў 24 гадзіны, каб прыехаць у Мінск і паўдзельнічаць у мерапрыемстве.

«Федэральны канцлер добра ведае пра Мінскі форум і падтрымала ўдзел у ім міністра Пафалы. Тое, што на адным тыдні ў Беларусі знаходзяцца два федэральных міністра — Рональд Пафала, а таксама міністр замежных спраў, віцэ-канцлер Гіда Вестэрвеле, сведчыць пра тое, што мы выходзім на новую стадыю нашых узаемадачыненняў, і я спадзяюся, што гэта толькі пачатак нашага далейшага супрацоўніцтва», — адзначыў Райнер Лінднер.

Вельмі важнай тэмай Мінскага форума, па словах яго кіраўніка, з'яўляецца сітуацыя з малым і сярэднім бізнесам. У рамках Мінскага форума працуе эканамічны блок (у гатэлі «Crown Plaza»), у якім удзельнічаюць прадстаўнікі бізнесколаў Германіі і Беларусі. «Важна, што гэта адбываецца напярэдадні вялікага Беларускага інвестыцыйнага форума ў Германіі, які адбудзецца 17 лістапада ў Франкфурце-на-Майне», — сказаў прафесар Лінднер і дадаў, што не меншая ўвага Мінскага форума будзе нададзена кааперацыі Беларусі і Германіі ў сферы адукацыі.

Як адзначыў дарадца-пасланнік пасольства ФРГ у Беларусі Петэр Дэтмар, Мінскі форум з'яўляецца цэнтральнай падзеяй у білатэральных стасунках Беларусі і Германіі. «Тое, што сёлета Мінскі форум адбываецца ўжо ў трынаццаты раз, сведчыць пра тую вялікую ролю, якую адводзяць яму арганізатары і ўдзельнікі», — падкрэсліў дыпламат.

Вяртаючыся да тэмы прэзідэнцкіх выбараў, Райнер Лінднер адзначыў, што, з пункту гледжання Бруселя, яны стануць паказчыкам і індыкатарам таго, наколькі хутка будуць развівацца праекты ў супрацоўніцтве ЕС і Беларусі.

«Вельмі шмат будзе залежаць ад таго, як пройдуць выбары, якія ацэнкі дадуць ім міжнародныя назіральнікі, якія ўжо знаходзяцца тут. У гэтым годзе вельмі цікава будзе паглядзець, як будуць адрозніваць ацэнкі назіральнікаў ад СНД, ад АБСЕ і Еўрасаюза, — сказаў кіраўнік Мінскага форума. — Але ў мяне яшчэ ёсць вялікае пажаданне на адрас Бруселя. Мы ўсе ведаем, што зараз вельмі актыўна абмяркоўваецца пытанне візавага рэжыму для беларусаў і чакаецца спрашчэнне гэтага працэсу. Па меншай меры, чакаецца працэс перагляду гэтага рэжыму. І сэнс звароту да Бруселя ў тым, што не трэба рабіць прывязку вынікаў выбараў да вырашэння гэтага пытання, таму што пытанне спрашчэння візавага рэжыму тычыцца менавіта насельніцтва Беларусі, любога чалавека ў гэтай краіне. А ў тым, як праводзяцца выбары, шараговыя выбаршчыкі не вінаватыя».

Як сцвярджаюць арганізатары, сёлетні Мінскі форум з'яўляецца рэкордным не толькі па колькасці яго ўдзельнікаў, але і па ўзроўню прысутнасці і прадстаўніцтва.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# ДЗВЕ АНЖАЛІКІ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Не так даўно мой добры сябар (зямляк і калега), які шмат гадоў працуе ва Украіне, спытаў, кім я сябе больш адчуваю: беларусам або палякам. Сёння я б на такое пытанне адказаў адразу — ліцвінам, бо гэта слова, на мой погляд, яднае і першых, і другіх. Моцна яднае. Настолькі, што ўсё зразумела нават існуючай уладзе.**



Анжаліка Борыс



Анжаліка Арэхва

## Аптымістычны пралог

Калі ў чарговы раз разгарэўся скандал вакол неафіцыйнага Саюза палякаў, сярод аналітыкаў і палітыкаў існавала шмат розных версій прычын яго ўзнікнення, бо ніхто не мог зразумець, каму і нашто ён быў увогуле патрэбны. Хадзіла нават версія пра сцэнары расійскай ФСБ, якая, добра ведаючы пра адмоўнае стаўленне Захаду да парушэнне правоў нацыянальных меншасцяў, спрабавала такім чынам сарваць манеўр беларускага рэжыму у бок Захаду.

Упэўнены, многія выкажуць на гэты конт жорсткую крытыку і, на мой погляд, будуць мець рацыю, але хацеў бы звярнуць увагу на адзін істотны момант. Скандал разгарэўся якраз у той момант, калі кіраўнік Беларусі знаходзіўся з візітам у далёкай Арменіі, адкуль накіраваўся ў не менш далёкую Лацінскую Амерыку...

Іншая справа, што, калі вярнуўся дадому, ён, як кажуць, не дэзавуіраваў дзеянні сваіх падначаленых. Мог выйсці сухім з вады, заявіўшы, напрыклад, што да гэтага не мае ніякага дачынення. Нічога падобнага ён не зрабіў, і тлумачэнне тут вельмі простае. Калі нехта і праявіў асабістую ініцыятыву, яна цалкам адпавядала «агульнай лініі партыі». Партыі ўлады, якая нідзе і ніколі не трывае непадкантрольныя структуры. Асабліва перад выбарамі...

А пачыналася ўсё так прыгожа. У 1988 годзе адбыўся дэбют польскага культурнага грамадскага аб'ядання імя Адама Міцкевіча. Менавіта з яго ў 1990 годзе і вырас Саюз палякаў Беларусі. Пачалі выдавацца газета і часопіс СПБ, а ў Гродна і Ваўкавыску адчыніліся першыя школы з выкладаннем на польскай мове. Усяго ж польская мова сёння выкладаецца ў 280 школах і дзіцячых садках Беларусі. Галоўным накірункам новай арганізацыі стала асветніцкая дзейнасць, азнаямленне з гісторыяй Польшчы, асабліва ў кантэксце яе няпростых перакрыжаванняў з гісторыяй Беларусі. У верасні 1993 года пад эгідай Саюза палякаў на Беларусі (СПБ) адбыўся першы сход ветэранаў Арміі Краёвай.

На момант расколу СПБ у яго шэрагах налічвалася амаль 25 тысяч чалавек, з тых 400 тысяч, якія зараз жывуць у нашай краіне (толькі ў Гродне — 40 тысяч палякаў). Колькасць «пярвічак» набліжалася да сотні, працавала 16 Дамоў польскіх. Прыведзеныя лічбы — на 2005 года, бо сёння ў палякаў Беларусі два аб'яднанні — афіцыйнае і неафіцыйнае, якія не сябруюць, скажам так, паміж сабой.

## Прагназаваны канфлікт

Як вядома, без канфлікту немагчымы ніякі сюжэт, таму было б дзіўна, каб ён не закрануў беларускіх палякаў. Увогуле, часам складваецца ўражанне, што ў нашай краіне жывуць самыя ярыя ў свеце прыхільнікі нейкага дуалізму. Два Народныя фронты, дзве кампартыі, два асноўных прафсаюзы, два пісьменніцкіх аб'ядання. Нават журналістаў падзялілі на дзве групы. «Чэсныя» з большасці ўваходзяць у афіцыйны Саюз журналістаў Беларусі, а «нячэсныя» — пераважна ў Беларускую асацыяцыю журналістаў. Адзін сцэнар на ўсіх.

На VI сходзе СПБ, які праходзіў 12–13 сакавіка ў Гродне, старшынёй Саюза палякаў была абрана Анжаліка Борыс. На сход сабралася 287 дэлегатаў. Калі выбіралі новага кіраўніка, асноўная барацьба разгарнулася паміж Т. Кручкоўскім і А. Борыс. За былога кіраўніка прагаласавала 116 дэлегатаў, за смелую жанчыну — 152.

Не трэба быць вялікім матэматыкам, каб зразумець, хто перамог, але сённяшнія ўлады не ўмеюць прайграваць. Кажуць, усё, што адбывалася з СПБ далей, было інспіравана менавіта імі, але мы пазбегнем такой катэгарычнасці і абмяжуемся толькі тым, што выбар сходу СПБ некаторым не прыйшоўся да спадобы.

Яны і падалі скаргу ў беларускае Міністэрства юстыцыі. 12 мая 2005 года вынікі галасавання былі адменены. Правесці паўторны сход, як таго патрабаваў Мінюст, паплечнікі Борыс адмовіліся.

Нарэшце 27 ліпеня такое рашэнне было прынятае. Але ўжо без іх. У гэты момант (супадзенне?) Гродзенская гарадская арганізацыя СПБ выключыла са сваіх шэрагаў Анжаліку Борыс і яшчэ восем найбольш актыўных праўдалюбцаў.

Паўторны сход адбыўся ў Ваўкавыску 27 жніўня 2005 года. Новым лідэрам СПБ быў абраны пенсіянер і былы дырэктар школы Юзаф Лучнік — тыповы прадстаўнік электарату існуючай улады. Адразу ж у незалежнай прэсе з'явіліся звесткі, што вынікі выбараў былі фальсіфікаванымі, актыўна выкарыстоўваўся так званы адміністрацыйны рэсурс.

Новае кіраўніцтва адмовіліся прызнаваць не толькі мясцовыя іншадумцы на чале з Борыс, але і польскія ўлады. Так адбыўся раскол. Цікавая дэталь: у адрозненні ад іншых шматлікіх расколаў, якімі адзначаны лёс многіх дэмакратычных партыйных і грамадскіх структур, «праўладныя» палякі і ім апазіцыйныя называюць сябе аднолькава — Саюз палякаў на Беларусі.

## Зігзагі сюжэту

А зараз некалькі біяграфічных звестак і лічбаў.

Анжаліка Борыс нарадзілася 14 кастрычніка 1973 года ў Гродзенскім раёне. Скончыла педагагічны каледж у Замосці (горад у Люблінскім ваяводстве Польшчы) і Беластоцкі ўніверсітэт. Працавала настаўніцай у Адэльску і Гродна. У 1995 годзе ўступіла ў Саюз палякаў на Беларусі, а ў 1998 годзе стала там кіраўніцай аддзелу адукацыі. З гэтай пасады яе і абралі старшынёй СПБ.

У жыцці Анжалікі Борыс былі яшчэ адны выбары. У 2009 годзе яе пераабралі кіраўніком «нефармальнага» СПБ. Акрамя Анжалікі на гэта крэсла прэтэндаваў і кіраўнік гродзенскай арганізацыі Мечыслаў Яскевіч. За Борыс прагаласавалі 148 дэлегатаў, за Яскевіча — 15.

Як бачна, перавага больш чым пераканаўчая. Таму для многіх стала поўнай нечаканасцю, калі 12 чэрвеня 2010 года Борыс абвясціла пра сваю адстаўку. Згодна са статутам Саюза палякаў, выконваць абавязкі старшыні ў такой сітуацыі можа адзін з намеснікаў, якіх чатыры. Галоўны Савет 19 чэрвеня даручыў кіраванне арганізацыяй на бліжэйшыя 2 гады другой Анжаліцы — пані Арэхва.

З Борыс яны аднагодкі, бо Анжаліка Арэхва нарадзілася ў Лідзе 6 верасня 1973 года. У 1996 скончыла Люблінскі ўніверсітэт імя Марыі Складоўскай-Кюры па спецыяльнасці «польская філалогія», а ў 2002 годзе — аспірантуру (англійская філалогія) у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце.

Пасля вяртання ў Беларусь Арэхва актыўна прымала ўдзел у дзейнасці польскай абшчыны. Спачатку працавала ў Дэпартаменце адукацыі Саюза палякаў на Беларусі. У 1998 годзе Анжаліка Арэхва стала настаўніцай польскай мовы, а праз год — намеснікам дырэктара каледжа СПБ. З 2005 года выступала ў якасці дырэктара польскай школы ў Гродна. З гэтага ж года была намеснікам старшыні арганізацыі, адказвала за пытанні адукацыі. Агульны «стаж» у нефармальным СПБ у Арэхвы складае больш за дзесяць гадоў.

**Права на на ўласнасць Дамоў польскіх часта станавілася повадам для спрэчака. Па некаторых дадзеных, з 14 Дамоў польскіх, якія кантралююцца афіцыйнай структурай, актыўна працуюць толькі два — у Лідзе і Магілёве**

Сапраўдных прычын гэтай «ракіроўкі» не ведае ніхто акрамя самой Анжалікі Борыс, але б якімі яны не былі, пры сустрэчы з ёй асабіста я зніму капялюш і пацалую руку, бо пяць гадоў супрацьстаяць гэтай уладзе можа толькі БАЕЦ.

Дарэчы, слова «ракіроўка» я напісаў не выпадкова. На шахматнай дошцы эліты СПБ яны амаль памяняліся месцамі. Адна прыгожая Анжаліка змяніла другую прыгожую Анжаліку. І, ўпэўнены, многія мужчыны ад гэтай прыгажосці адчулі ўпэўненасць у заўтрашнім дне.

## Працяг замест эпілога

Не хачу займаць чыйсьці канкрэтны бок, але дастаткова толькі паглядзець на сайт афіцыйнага СПБ, каб зразумець, што з акуратнасцю тут ёсць пэўныя праблемы. Як і з адносінамі да справы.

Не так даўно мне расказалі адзін цікавы момант. Падчас чарговага «наезду» на нефармальны СПБ, які скончыўся сумна вядомай судовай «экспрапрыяцыяй» Дома польскага ў Івянцы, кіраўніцтва афіцыйнага СПБ нечакана звярнула ўвагу на мінскі Дом польскі, які месціцца на вуліцы Саламянай. Нават ухвальны сюжэт пра яго дзейнасць для аднаго з беларускіх каналаў зрабілі. І ніхто не звярнуў увагу, чаму амаль усе памяшканні там здаюцца ў арэнду розным бізнесменам.

Дарэчы, пытанне вакол правоў на ўласнасць Дамоў польскіх, якія належаць СПБ, даволі часта станавілася галоўным у адпаведных спрэчках. Па некаторых дадзеных, з 14 Дамоў польскіх, якія кантралюючыя афіцыйнай структурай, актыўна працуюць толькі два — у Лідзе і Магілёве. Што будзе з будынкам у Івянцы? Як кажуць, пажывем — пабачым.

Пакуль адназначна можна сказаць толькі тое, што ўсе яны былі пабудаваныя або адрамантаваныя на польскія грошы. Пасля таго, як беларускія ўлады фактычна паставілі пад кантроль СПБ, палякі адмовіліся працягваць фінансаванне, інакш бы іх ніхто ў свеце не зразумеў.

А тым, хто гаворыць пра нейкую самастойнасць афіцыйнага Саюза палякаў, хачу сказаць адно — фінансуе гэту структуру беларуская дзяржава. Не буду сцвярджаць, што словы «фінансуе» і «кантралюе» на самай справе з'яўляюцца сінонімамі, але тое, што яны блізкія па значэнню — адназначна. Толькі ў 2009 годзе на гэтыя справы было выдзелена 300 мільёнаў беларускіх рублёў, што складае больш як 100 тысяч амерыканскіх долараў.

Наўмысна не акцэнтаваў вашу ўвагу на «разборках» вакол фірмы «Палоніка», бо тут так многа незразумелага, што лягчэй знайсці ў цёмным пакоі неіснуючую чорную котку, чым логіку ў дзеяннях беларускіх уладаў.

Рыхтуючы гэты нарыс, я з дапамогай вядомага гродзенскага журналіста Анджэя Пачобута спытаў Анжаліку Арэхва: будзе ці не працягваца «лінія Борыс»? І атрымаў адказ: «Барацьба за захаванне незалежнасці арганізацыі будзе працягнутая. На нейкія змены тут спадзявацца не варта».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 8 ЛІСТАПАДА, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** «У цэнтры ўвагі».
**10.35** «Культурныя людзі».
**11.05** Серыял «Маруся» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Каханне Аўроры».
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.30** Nota Bene.
**17.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.40** Серыял «Маруся» (Украіна).
**18.50, 02.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.10** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША).
**23.30** Дэтэктыўны трылер «Джэкі Браун» (ЗША).
**02.15** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здорава!».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Марскі патруль-2». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.50** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** Прэм'ера. «Алег Меньшыкаў. У цені сваёй славы».
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Паміж небам і зямлёй». Канцэрт.
**01.30** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «У тэму». Актуальнае інтэрв'ю.
**20.30** Фільм «Вар'яцкі лістапад 2». Расія.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «У адзін бок». Германія.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.15** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.20** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**12.35** Пра мастацтва.
**13.05** Школа рамонту.
**14.00** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Тэлебарометр.
**15.25** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Меладрама «Жорсткі раманс» (СССР). 1-я серыя.
**20.35** «Калыханка».
**20.50** Тэлебарометр.
**20.55** Беларуская часіна.
**22.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.20** Авертайм.
**23.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**00.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Дзеці з прабіркі». Дак. фільм.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** Тэлесерыял «Дворык».
**13.25** «Гарадок».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Пункт кіпення».
**22.20** Тэлесерыял «Участковая».
**23.20** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** Прэм'ера. «Я - кібарг. Чалавек будучыні. Якімі мы будзем». Дак. фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.10** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Псеўданім «Албанец».
**15.05** «Цуд-людзі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Прэм'ера. Баявік «Брацeнікі».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.50** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспорт на выхадных.
**09.45, 14.15** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). «Залаты этап».
**10.45, 15.15, 16.15** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Фіналы.
**12.45, 17.45** Марафон (Нью-Йорк, ЗША).
**19.00, 19.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый (Анксавіл, ЗША).
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**00.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**01.10** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».
**01.15** Марафон (Нью-Йорк, ЗША).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** ПраСвет.
**08.20** «Савецкая гісторыя», дак. фільм, 2008 г., Латвія.
**09.50** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**10.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.20** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма): «Перу, Амазонія, 1973», ч. 2.
**10.50** Дакументальная гадзіна: «Журналісты», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**11.40** «Час гонару» (Czas Honoru), серыял.
**11.30** Фільматэка майстроў: «На злом галавы», маст. фільм, 2004 г., Германія–Турцыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Сонечная дзіда», серыял: 3 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 2 серыя.
**18.20** Госць «Белсату».
**18.40** Невядомая Беларусь: «Код прысутнасці», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці пірамiды», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Прыватная калекцыя.
**21.40** Фільматэка майстроў: «На злом галавы», маст. фільм, 2004 г., Германія–Турцыя.
**23.40** Аб'ектыў.

## 9 ЛІСТАПАДА, АЎТОРАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.10, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Серыял «Маруся» (Украіна).
**11.40** «Актуальнае інтэрв'ю».
**12.10** Дакументальныя фільмы «Германія ў малюнках. Вернігеродэ», «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» (Германія).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Аўташкола.
**16.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Серыял «Маруся» (Украіна).
**18.50, 01.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**19.55** Меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША).
**23.00** «Лістапад-2010». Дзённік.
**23.30** Псіхалагічная драма «Белы алеандр» (ЗША - Германія).
**01.30** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Марскі патруль-2». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Уцёкі».
**22.20** Спецдаследаванне.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.20** «Віёла Тараканава. У свеце злачынных запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Вар'яцкі лістапад 2». Расія.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Меч». Серыял.
**21.25** «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.50** «Таямніца «Святога Патрыка». Серыял.
**00.50** «Баец». Серыял.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.00** Меладрама «Жорсткі раманс» (СССР). 1-я серыя.
**12.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**13.20** Авертайм.
**13.55** «Запал па культуры».
**14.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.35** Пазакласная гадзіна.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.40** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Меладрама «Жорсткі раманс» (СССР). 2-я серыя.
**20.30** Калыханка.
**20.50** Тэлебарометр.
**20.55** Беларуская часіна.
**22.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.10** «Спорт-кадр».
**23.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Сток Сіці - Бірмінгем.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Я вярнуся... Ігар Талькоў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** Тэлесерыял «Дворык».
**12.20** Тэлесерыял «Пункт кіпення».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Пункт кіпення».
**22.20** Тэлесерыял «Участковая».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Агент «Сябар» супраць Гітлера». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Псеўданім «Албанец».
**15.05** «Жывуць жа людзі!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Прэм'ера. Баявік «Брацeнікі».
**23.55** «Вочная стаўка».
**00.40** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.15** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**11.30** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі. Фіналы.
**13.15** Марафон (Нью-Йорк, ЗША).
**14.15** Фехтаванне. Чэмпіянат свету ў Францыі. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**15.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**16.00** Шары. Адкрыты чэмпіянат Шатланды (Перт). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**18.30, 20.15** Фехтаванне. Чэмпіянат свету ў Францыі (Парыж). Шабля. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**20.00** Алімпійскія гульні. Часопіс.
**20.05** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**21.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**22.00** Бокс. Міжнародны турнір у ЗША.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**00.15** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). «Залаты этап».
**01.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі. Фіналы.
**02.25** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Прыватная калекцыя.
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці пірамiды», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**09.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.15** Невядомая Беларусь: «Код прысутнасці», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.45** «Сонечная дзіда», серыял: 3 серыя.
**10.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**10.25** «Час гонару», серыял: 2 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Сонечная дзіда», серыял: 4 серыя.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 10 серыя.
**18.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** ПраСвет.
**20.35** Вагон.
**20.40** Хто ёсць кім?: Алег Трусаў.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Асабісты капітал.
**21.40** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 10 серыя: «Кампанія», Японія.
**22.30** Рэпартэр.
**22.55** «Доктар Марцін», серыял.
**23.45** Аб'ектыў.

## 14 ЛІСТАПАДА, НЯДЗЕЛЯ

**07.50** Дзень спорту.
**08.00** Прэм'ера. Дакументальны цыкл «Неразгаданая гісторыя» (ЗША).
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** Культурныя людзі.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага» Ток-шоў (Украіна).
**12.10** Трагікамедыя «Радня» (СССР).
**14.05** Адмысловы рэпартаж АТН: «Падводны свет», «Беларускія дайверы».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.00** Меладрама «Знойдзены» (Расія).
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.00** Камедыя «Вяселле» (Францыя).

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**10.00** «Шалапутныя нататкі».
**10.20** Пакуль усе дома.
**11.20** «Фазэнда».
**11.55** «Ранішняя пошта».
**12.30** Фільм «Каханая жанчына механіка Гаўрылава».
**14.05** Тэлечасопіс «Звяз».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Давай ажэнімся».
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.45** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: ток-шоў «Кухня».
**21.40** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя». Працяг.
**23.25** «Yesterday live».
**00.05** Рок-фэст «Стварэнне свету».

**06.50** Фільм «Эскадрылля Лафайет». ЗША - Вялікабрытанія, 2006 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: ««Гаворыць і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Завяшчанне прафесара Доуэля». СССР, 1984г.
**15.25** «Дарагая перадача».
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Памежны горад». ЗША, 2006 г.
**22.50** «Прафесійны бокс».
**23.55** Фільм «Олдбой». Паўднёвая Карэя, 2003 г.
**01.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**06.55** Дабравест.
**07.20** Мір вашай хаце.
**07.35** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**09.55** Медычныя таямніцы.
**10.35** Школа рамонту.
**11.45** Тэлебарометр.
**11.50** Бухта капітанаў.
**12.30** Кінаспробы.
**12.50** «Правы чалавека».
**13.05** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**14.55** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**15.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Эвертан - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**18.05** Эксцэнтрычная камедыя «Шырлі-мырлі» (Расія).
**20.40** Тэлебарометр.
**21.00** Смешная часіна.
**21.40** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**00.10** Культасвет.

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.30** «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**09.15** Фільм «Шлях дадому». 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Дэтэктыў «Шах каралеве дыяментаў».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Пакой смеху».
**15.45** Прэм'ера. «Рускія без Расіі. Выспа Лемнас. Руская Галгофа». Дак. фільм.
**16.55** Фільм «Дваццаць дзён без вайны».
**18.50** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера-2010. «Стылягі-шоў».
**23.00** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.00** Фільм «Так бывае».

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Бітва за Поўнач».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Асабліва небяспечны!».
**13.55** Баявік «Забароненае царства».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Развод па-руску».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. Баявік «Антыснайпер. Новы ўзровень».
**23.55** «Асабліва небяспечны!»
**00.25** «Футбольная ноч».
**01.00** «Нерэальная палітыка».

**09.30** Экачасопіс «Прыродныя крыніцы энергіі».
**09.35** Шары. Адкрыты чэмпіянат Шатландыі (Перт). Фінал.
**10.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Фінляндыі (Леві). Слалам. Жанчыны. 2-я спроба.
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Фінляндыі (Леві). Слалам. Мужчыны. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Фігурнае катанне. Зімовыя алімпійскія гульні ў Ванкуверы (Канада). Паказальны выступ.
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Фінляндыі (Леві). Слалам. Мужчыны. 1-я спроба.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Фінляндыі (Леві). Слалам. Мужчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.00** Шары. Адкрыты чэмпіянат Шатландыі (Перт). Фінал.
**16.30** Вось дык так!!!
**17.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Фінляндыі (Леві). Слалам. Жанчыны. 2-я спроба.
**18.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Фінляндыі (Леві). Слалам. Мужчыны. 2-я спроба.
**19.30** Фігурнае катанне. Зімовыя алімпійскія гульні ў Ванкуверы (Канада). Паказальны выступ.
**21.00** Шары. Адкрыты чэмпіянат Шатландыі (Перт). Фінал.
**22.30** Бокс.
**00.00** Мотаспорт па выходных.
**00.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Фінляндыі (Леві). Слалам. Мужчыны. 2-я спроба.
**00.55** Мотаспорт па выходных.
**01.00** Шары. Адкрыты чэмпіянат Шатландыі (Перт). Фінал.
**02.15** Мотаспорт па выходных.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**08.15** Вагон.
**08.30** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**08.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Галерэя Ады», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**09.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.50** Калыханка для самых маленькіх.
**10.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**11.20** «Паніка», трылер, 2000 г., ЗША.
**12.45** «Тры шалёныя нулі», серыял.
**14.05** Канцэрт гурта «N.R.M.»: ч. 1.
**15.00** Сальда (эканамічная праграма).
**15.20** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 4 серыя: «У пошуках Ґандзі».
**16.10** «Ранча», серыял: 4 серыя.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Прыватная калекцыя.
**17.40** «Час гонару», тэлесерыял: 3 серыя.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Сістэма», дак. фільм, 2008 г., Германія–Італія–Канада–Эстонія.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Род Алелькавічаў-Слуцкіх».
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце: «Выспы Кірыўіна».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.50** Фільматэка майстроў: «Мастацтва плакаць», маст. фільм, 2006 г., Данія.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Сябра».
**23.45** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ПРАТЭСТЫ

# СТУДЭНТЫ ІДУЦЬ НА ВУЛІЦЫ

Алег НОВІКАЎ

**Францыю ахапілі пратэсты супраць пенсійнай рэформы, авангардам якіх з'яўляецца студэнцкі прафсаюз (UNEF) і вучні ліцэяў.**




Рух супраць пенсійнай рэформы Сарказі стартаваў яшчэ ў сакавіку гэтага года. Нагадаем, што сутнасць прапанаваных зменаў заключаецца ў тым, каб з 2018 года ўзняць тэрмін выхаду працоўнага француза на пенсійны адпачынак: з 60 да 62 гадоў. Такім чынам урад мае надзею часткова вырашыць праблему бюджэтнага дэфіцыту. Па разліках спецыялістаў, з улікам росту працягласці жыцця на аплату пенсій у 2020-х гадах спатрэбіцца да 58 працэнтаў ВУП.

У сваю чаргу, прафсаюзы і левая апазіцыя ацэньваюць ідэю Сарказі як сацыяльна несправядлівы праект, паколькі праблему дэфіцыту можна было хутчэй вырашыць за кошт павелічэння падаткаў на багацце і кантролю над рухам банкаўскага капіталу. У дадатак, выхад на пенсію ў 60 гадоў — гэта было адным з гістарычных патрабаванняў працоўнага руху, рэалізаваных пасля прыходу да ўлады Франсуа Мітэрана.

За гэты час прафсаюзы здолелі мабілізаваць некалькі мільёнаў чалавек. Аднак 7 кастрычніка адчыніла новую старонку цяперашніх пратэстаў. На вуліцу выйшлі вучні ліцэяў і студэнты. Гэта адразу пагоршыла паліцэйскую статыстыку. З усёй Францыі прыходзілі паведамленні пра новыя выпадкі вулічных сутыкненняў паліцыі і маладых маніфестантаў. Тыя бойкі ўжо выклікалі вялікую грамадскую палеміку. Прэзідэнцкая парламенцкая большасць вінаваціць апазіцыю ў тым, што яна прымушае моладзь рызыкаваць здароўем. Апазіцыя адказвала : «Маладыя дзейнічаюць свядома і ведаюць, чаму яны выходзяць на вуліцу».

Галоўная фішка студэнцкіх лідэраў — у цікавай арыфметыцы. Адпаведна лічбам, калі сталыя людзі будуць працаваць яшчэ два гады, колькасць маладых кадраў на прадпрыемствах будзе скарачацца ў сярэднім на 1 мільён штогод. На рынку і так шмат маладых беспрацоўных, якія гатовыя за малыя грошы працаваць пагадзінна. Цяпер кошт іх працы з-за напłыву новых канкурэнтаў будзе яшчэ танней. Студэнцкія правадыры лічаць, што пры такой схеме маладыя людзі змогуць уладкавацца на сталую працу толькі ў гадоў у 30.

Выхад моладзі на вуліцу значыць пераход канфлікту вакол рэформы ў самую гарачую стадыю.

Увогуле, гісторыя студэнцкіх бунтаў даўно з'яўляецца часткай французскай палітычнай культуры. Самае парадаксальнае, што студэнцкія прафсаюзы ўзніклі як праект маладых кансерватараў. У 1909 годзе ў Лілі аформілася Генеральная студэнцкая асамблея (AGE), якая супрацоўнічала з царквой. Больш таго, пасля падзення Трэцяй рэспублікі ўлетку 1940 года AGE вітаў стварэнне рэжыму Вішы.

Пасля вайны AGE ператварыўся ў масавую студэнцкую арганізацыю левай арыентацыі. Перш за ўсё новыя кіраўнікі прафсаюзу змянілі яго назву, якая, на іх думку, мела асацыяцыю з фашызмам. Замест AGE прафсаюз пачаў называцца UNEF. У левым духу перапісалі і статут арганізацыі. «Студэнт — гэта пралетарый, які працуе інтэлектуальна», — гаворыцца ў яго прэамбуле.

Пераход на левыя пазіцыі выклікаў пратэст з боку правай фракцыі. Падзелу спрыяла вайна ў Алжыры. Як і ўся Францыя, сябры прафсаюзу падзяліліся на прыхільнікаў незалежнага Алжыру і крытыкаў. Правадыром правых быў Жан-Мары Ле Пэн, будучы заснавальнік Нацыянальнага фронту. У 1956 годзе ён і яго кампанія пакінулі прафсаюз і заснавалі Федэрацыю французскіх студэнтаў, якая падтрымала ўрад. Аднак выпрабаванне часам федэрацыя не вытрымала.

Менавіта студэнты справакавалі славутую Майскую рэвалюцыю 1986 года. Дарэчы, традыцыя рэгулярна выходзіць на вуліцу ўзнікла толькі ў 1986 годзе, калі пры левым прэзідэнце Мітэране ўзнік правы кабінет галістаў.

Той пратэст быў выкліканы замахам на аўтаномію ВНУ. Праз тры тыдні пратэстаў студэнты перамаглі: міністр адукацыі сышоў у адстаўку разам са сваім законапраектам. Аднак перамога была аплачана смерцю 16-гадовага хлопца, забітага паліцэйскімі. Менавіта пасля таго, як мільён чалавек маўкліва прайшоўся па Лацінскаму кварталу ў памяць пра забітага, міністр быў вымушаны напісаць рапарт з просьбай пра адстаўку.

У 1994 годзе прафсаюзы моладзі мабілізаваліся супраць праекта ўвесці так званы Кантракт прафесійнага ўключэння (CIP). Яго ідэя ў тым, што выпускнік ВНУ павінен быў атрымліваць меншы заробак, чым дарослы працоўны. У сакавіку, пасля серыі маніфестацый, прэм'ер-міністр адмовіўся ад гэтай ідэі.

1999-ы навучальны год пачаўся з таго, што міністр адукацыі Клод Алегрэ патрабаваў «зрабіць менш тлустым маманта, які называецца Міністэрства адукацыі». Гаворка была пра тое, каб скарацiць фінансаванне настаўнікам. У адказ дзясяткі тысяч настаўнікаў абвясцілі пратэст. Іх падтрымалі студэнты. Закон праваліўся.

Увесну 2005 года праект рэформы адукацыі Франсуа Фіёна, міністра адукацыі зноў вывеў студэнтаў на вуліцы. Гэта стала пралогам пратэстаў 2006 года супраць Закона аб кантракце першага найму. Яго ідэя была ў тым, каб маладыя спецыяліст меў меншыя сацыяльныя гарантыі і не меў права пераглядзець кантракт на працягу двух гадоў. Дэманстрацыі прымусілі ўрад зноў адступіць. Каб замяць справу, прэзідэнт Жак Шырак прыняў такую рэдакцыю закону, у якой пра кантракт першага найму няма ні слова.

У 2007 годзе ўпершыню ў гісторыі баставала палова з 85 універсітэтаў. Яны дабіваліся адмены новага закона аб універсітэтах. У 2008-м яны адправілі ў архівы яшчэ адзін законапраект — радыкальную рэформу ліцэяў.

З такімі багажом студэнты і ўлада падышлі да кастрычніка 2010 года. Якой будзе вынік цяперашняй бітвы?

Эрык Вёрт, міністр працы, кажа, што будзе ісці са сваім законам пра пенсіі да самага канца. Яму супярэчыць левая газета «Liberation»: «Удзел моладзі з вулічных акцыях паралельна з забастоўкамі ў вядучых сектарах можа змяніць сітуацыю».

Між тым, шмат хто баіцца, што любыя сутычкі моладзі з паліцыяй могуць закончыцца трагедыяй 1986 года, калі хтосьці са студэнтаў будзе забіты. Улады намагаюцца перакласці ўсю маральную адказнасць за акцыі студэнтаў і іх наступствы на левых. У сваю чаргу, Сегален Руаяль, адзін з лідэраў сацыялістаў, заклікала студэнтаў «пратэставаць, аднак выключна мірнымі сродкамі».

Наступная мабілізацыя UNEF прызначана на канец гэтага тыдня.




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка яшчэ спрабуе абараніць нацыянальныя інтарэсы і супрацьстаяць імперскім замашкам Крамля, таму перыядычна вядзе «малочныя», «піўныя» і іншыя камерцыйныя войны з Масквой. А Назарбаеў, наадварот, як мага гучней заяўляе пра неабходнасць будаваць эканамічны, палітычны, мытны, ваенны і іншыя саюзы з Расіяй.

**«Белый парус» (Казахстан)**

Ніякіх унутраных перашкод на пасадзе прэзідэнта Беларусі ў Аляксандра Лукашэнкі няма. Іншая справа, што з Масквой яму ўсё ж лічыцца даводзіцца. Зусім зразумела, што за кошт продажу абутку, мэблі і набору вытворчай тэхнікі эканоміку краіны не ўтрымаць. Патрэбныя іншыя грошы, і лепш за ўсё дармовыя, якія якраз і забяспечвае пастаўка расійскага газу ў Беларусь і яго транзіт у Еўропу. Аляксандр Рыгоравіч пра гэта казаў, выгаворваў расійскаму тандэму (Мядзведзеў—Пуцін) за разрыў саюзных дамоўленасцяў шляхам узняцця коштаў на энерганосьбіты. Толькі каза тут зусім простая: усякаму прадукту — яго рынкавы кошт.

**«Хакасия» (Расія)**

Якому варыянту аддадуць перавагу ўдзельнікі прэзідэнцкай гонкі — пакажа час, але ўжо ясна, што зарэгістраваныя кандыдаты не выпусцяць моманту выступіць па агульнанацыянальным тэлебачанні, радыё і ў дзяржаўных газетах. Вось тут і патрэбна каардынацыя і размеркаванне роляў, каб, у першую чаргу, распавесці пра рэальнае становішча спраў у краіне, пра тое, што за чалавек кіруе краінай ужо 16 гадоў і як ён гэта робіць. І толькі потым прадставіць уласную праграму. Гэта значыць, Лукашэнку трэба біць яго ж зброяй узору 1994 года, калі народ галасаваў, у першую чаргу, супраць камуністычнага рэжыму, які ўсім надакучыў, а ўжо потым за нейкага кандыдата ў прэзідэнты.

**«Голос России» (Расія)**

Фактычна ж беларускаму рэжыму прапанавана своеасаблівае пагадненне. Афіцыйны Мінск праводзіць выбары так, каб у Еўропы не было падстаў зноў іх не прызнаць. Еўрасаюз жа заплюшчвае вочы на хранічныя праблемы з базавымі дэмакратычнымі каштоўнасцямі ў Беларусі і канцэнтруецца на эканамічным баку дыялогу.

**«Delfi» (Літва)**

Самае галоўнае — гэта становішча матэрыяльнае, забеспячэнне таннымі прадуктамі, зарплатамі і г.д. Абяцанні павялічыць зарплату да 500 долараў у эквіваленце, як яны кажуць, магчыма толькі на гэтым этапе. З наступнага года Беларусь пачне аддаваць міжнародныя пазыкі. Тады трэба ўключаць друкарскі станок, магчымая дэвальвацыя, магчымае чарговае падзенне наміналу беларускага рубля і г. д. Кошты пойдуць угару пасля Новага года — гэта непазбежна. Вось да Новага года з 1 лістапада павялічваем зарплаты, пенсіі — электарат задаволены, пойдзе з падвышанымі зарплатамі і пенсіямі на выбары, падтрымае кіраўніка дзяржавы. А што будзе пасля Новага года, час пакажа. Я думаю, што разлік рабіўся першым чынам на гэты фактар.

**«Эксперт» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. САРКАЗІ — МАРШАЛ ПЕТЭН СЁННЯ


Бэнджамін Лансар

Бэнджамін Лансар, кіраўнік моладзевай арганізацыі «Саюз за народны рух» (UMP), лідэрам якой з'яўляецца прэзідэнт Нікаля Сарказі, быў вымушаны напісаць заяву пра сваю адстаўку. Прычынай стала неасцярожная заява ў блогу: абараняючы пенсійную рэформу, супраць якой выступае вядучы студэнцкі прафсаюз, Бэнджамін параўнаў цяперашнюю сітуацыю з 1940-м годам, калі ў Францыі паўстаў прагітлераўскі рэжым Вішы. Калі верыць Лансару, Сарказі робіць сёння нешта падобнае, што стварыў у 1940-м маршал Петэн — выцягнуў краіну з крызіснай сітуацыі нягледзячы на тое, што маладыя французы патрабавалі працягу супраціву фашыстам. Нататкі Бэнджаміна адразу заўважылі яго ідэйныя ворагі з лагеру маладых сацыялістаў і Зялёных. Яны абвінавацілі лідэра маладых правых у тым, што ён спрабуе апраўдаць Гітлера і акупацыю. Давялося Лансару пісаць заяву пра сыход па асабістым жаданні.

**По матэрыялах «Le Figaro» (Францыя)**

### МАЛДОВА. ПРЫДНЯСТРОЎЕ ПАДТРЫМАЕ СЕПАРАТЫСТАЎ

Абсалютна нечаканай была рэакцыя прыднястроўскай афіцыйнай прэсы на юбілей часовага далучэння Трансільваніі да Венгрыі ў верасні 1940 года. Нагадаем, што Венгрыя ў выніку першай сусветнай страціла большую частку былога Венгерскага каралеўства, якое ўваходзіла ў дзяржаву Габсбургаў. Самай вялікай была страта багатай Трансільваніі, якая перайшла да Румыніі. З таго часу Будапешт жыў (і нават цяпер часткова жыве) марамі пра вяртанне Трансільваніі. Асабліва моцныя былі такія мары пасля таго, як СССР улетку 1940-га далучыў Малдову. Венгры адразу запатрабавалі вярнуць ім Трансільванію, і Гітлер разам з Мусаліні, каб не абурацъ важнага саюзніка, даў згоду. Праз ціск Берліну і Рыму румыны вярнулі частку Трансільванскага краю ў склад Венгрыі. Праўда, у 1945 годзе статус-кво быў аднаўлены. І вось цяпер з нагоды юбілею таго рашэння прыднястроўская прэса заклікае свой урад наладзіць кантакты з Будапештам, каб разам распальваць сепаратысцкія настроі ў Трансільваніі для перашкоды Бухарэсту далучыць Малдову. Увогуле, ідэя прыднястроўскіх палітолагаў цалкам укладваецца ў логіку палітыкі цяперашняга ўраду Венгрыі, які падтрымлівае венгерскую дыяспару. Аднак наўрад ці венгры будуць сябраваць за спінай ЕС з такім супярэчлівым рэжымам, як Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка (ПМР).

**Па матэрыялах малдаўскай прэсы**

### РАСІЯ. НІХТО НЕ ХОЧА НА КАЎКАЗ




У расійскім інтэрнэце ідзе віртуальная вайна вакол акцыі па зборы подпісаў за выхад Стаўрапольскага краю са складу Паўночна-Каўказскай федэральнай акругі. Паўночна-Каўказская федэральная акруга (СКФО) сфармаваная ўказам прэзідэнта Мядзведзева ў студзені гэтага года. У склад акругі ўвайшлі сем нацыянальных рэспублік Паўночнага Каўказа і Стаўрапольскі край. Упершыню заклік быў апублікаваны 10 кастрычніка. За чатыры дні пад заявай падпісаліся каля 10 тысяч расіян, у тым ліку з іншых рэгіёнаў краіны. Аўтары звароту пішуць пра пачуццё страху, якое адчуваюць зараз жыхары Стаўраполля. Адзначаецца, што пагоршылася крымінальная сітуацыя і павялічыўся адток славянскага насельніцтва. Жыхары краю заклікаюць кіраўніцтва Расіі вярнуць Стаўрапольскі край у Паўднёвую федэральную акругу. Губернатар Стаўрапольскага краю Валерый Гаеўскі назваў ініцыятыву правакацыяй. Тым часам палітолагі кажуць, што заява жыхароў Стаўраполля пра выхад з Паўночна-Каўказскай акругі ёсць адной з самых значных падзей гэтай восені на расійскім Каўказе. «Палітычныя эксперыменты прывялі да ксенафобіі і паставілі краіну на мяжу велічэзнай катастрофы», — кажуць яны.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

ЦІКАВА



# НАСТАЛЬГІЯ ПА КЕПЦЫ

*Алег НОВІКАЎ*

**Не паспелі «карупцыянера» Лужкова адправіць у адстаўку, як у расійскім грамадстве пачалася палеміка наконт спадчыны былога мэра. Парадокс, аднак цяпер шмат хто ўжо сумуе па мужу Алены Батурынай. Прапануем агляд расійскіх інтэрнэт-форумаў на гэту тэму.**

Рост сімпатый да Лужкова шмат у чым звязаны з тым, што як асоба ён больш цікавы і заўважны, чым новы мэр. Гэта цалкам лагічна, паколькі Лужкоў сам прабіўся ва ўладу праз сіта свабодных выбараў. Сабянін — прызначэнец, гайка сістэмы, ад яго патрабуюць быць добрым функцыянерам, аднак не яркім палітыкам. Маскоўская публіка ад яго, здаецца, не ў захапленні.

Блогер Рэндольф адзначае ў сваім ЖЖ: «Увесь тыдзень пустога і бясколернага Сабяніна агітпроп спрабаваў прадставіць эфектыўным менеджэрам. Новы мэр рабіў разумны твар, але нічога канкрэтнага сказаць так і не здолеў. Ён за ўсё добрае і супраць усяго дрэннага. Хто б сумняваўся. Але, на жаль, ніякай прапагандысцкай фінціфлюшкі пад Сабяніна так і не здолелі прыдумаць. Канкрэтных ідэй тут нуль».

Набыла папулярнасць ідэя пра тое, што Лужковых было два. Лужкоў ранні і добры і Лужкоў позні і кепскі.

Так, Вячаслаў Глазычаў, сябра Грамадскай палаты, высока ацэньвае першыя 3 гады знаходжання Лужкова ва ўладзе (1992–1995 гады). За гэты час Лужкоў, па словах эксперта, «прывёў горад у парадак у становішчы поўнага развалу канца 1980-х гадоў».

«Пачынаючы з сярэдзіны 1990-х гадоў тэхналогія кіравання буйным мегаполісам не адрознівалася ад кіравання асабістым маёнткам. Ціск на сістэму мясцовага самакіравання, ператварэнне ўсіх двароў у паркоўкі — гэта ўсё ўжо выйшла з-пад кантролю», — адзначыў Глазычаў.

А вось Аляксандр Лебедзеў, стары апанент Лужкова, лічыць, што ранейшы мэр быў нядрэнным сіці-менеджэрам да 2003 года. А затым пачалося нешта жудаснае. «Па-першае, архітэктурнае варварства, па-другое, будаўніцтва розных шопінг-цэнтраў наўпрост на пляцах Садовага кольца. Пасля — «Масква-Сіці», куды накіроўваліся ўсе фінансы горада. Навошта нам гэты праект? Як толькі туды пераедуць усе гэтыя заможныя кліенты і будуць сядзець там без парковак, з'явіцца яшчэ адзін тромб. Цешыцца тут няма чым. А апошнія тры гады ён з жонкай сядзеў на розных грашовых будаўнічых плынях», — сказаў Лебедзеў у інтэрв'ю «Камсамольскай праўдзе».

Трэба прызнаць, што спробы неяк рэабілітаваць Лужкова пакуль не падабаюцца большасці грамадства. Блогер Artem у рамках палемікі з фанатамі Міхаіла Юр'евіча згадвае самыя валюнтарысцкія праекты былога гарадскога галавы.

«У пачатку зімы 2001 года Лужкоў заявіў, што ў хуткай будучыні лёд з дахаў маскоўскіх будынкаў будуць збіваць лазерамі. На праект выдаткавана каля паўмільёна долараў. У выніку лазер зразаў адну ільдзінку цэлую гадзіну. Праект замарозілі. Міліцэйскае патруляванне Масквы на дырыжаблях павінна было пачацца ў 2002 годзе. Два дырыжаблі і тры аэрастата агульным коштам 2,5 мільёна долараў былі пабудаваны і перададзены міліцыі Масквы. Аднак спецтранспарт падняўся ў паветра толькі на адзін метр. Узляцець вышэй дырыжабль не змог. У 2006 годзе мэрыя прапанавала падводныя гаражы. Напачатку 2002 года мэр Масквы звярнуўся да Уладзіміра Пуціна з прапановай рэанімаваць адпрэчаны за 15 гадоў да гэтага праект накіраваць раку Об у басейн Аральскага мора. Нарэшце, у 2004 годзе Лужкоў заявіў пра неабходнасць паглядзець, ці ёсць умовы, каб «парушыць» кукурузу і сою на поўнач — у Падмаскоўе і падобныя ім па кліматычных умовах рэгіёны. Але соя і кукуруза ў Падмаскоўі так і не выраслі».

Самай эфектыўнай зброяй крытыкаў Лужкова застаецца яго ная палітыка ў галіне архітэктуры і манументальнага мастацтва. Як вядома, Лужкоў за 18 гадоў перабудаваў Маскву. Фішкамі лужкоўскага стылю сталі помнікі Цэрэтэлі, вежы на будынках, якія нагадвалі гіганцкія алоўкі, шкло і метал, якія сталі галоўнымі ўпрыгожваннямі фасадаў дамоў. Нарэшце, хаатычны характар забудовы. Лушковафобы робяць катэгарычнае рэзюме:

«Ігнараванне сапраўднасці — вось што характэрна для Масквы апошніх 20 гадоў, — кажа каардынатар руху «Архнадзор» пісьменнік Кастусь Міхайлаў. — Для сталічных уладаў стала нормай знесці штосьці старадаўняе, замяніць копіяй і павесіць на яе мемарыяльную дошку. Прычым Юры Міхайлавіч не саромеўся прапагандаваць ідэю, што копія можа быць не горшай за арыгінал. Але гэта супярэчыць сэнсу закона пра ахову помнікаў!»

У любым выпадку, у Лужкова патэнцыял вельмі добры. Цяпер усе кепскае ў грамадстве ўспрымаецца праз праекцыю на часы Лужкова. Вось добры прыклад такой тэндэнцыі.

«З моманту адстаўкі Лужкова ў Маскве з'явіліся, як апенькі на гнілым дрэве, ігральныя ўстановы. Канешне, там не напісана «ігральны клуб» ці «ігральныя аўтаматы», але сцены ўстаноў у зорках пазнае любы, нават хто ніколі не гуляў. Улічваючы дыяпазон гэтых установ тэрытарыяльна (любая акруга ўключаючы цэнтральны — на Кітай Горадзе) можна зрабіць выснову, што дазвол атрыманы зверху, гэта значыць, ад мэрыі. Час узнікнення гэтых установ сведчыць пра наяўнасць сувязі са зменай мэра», — піша нехта tver13_ru.

Падводзячы першыя вынікі аналізу феномена настальгіі па Лужкову, можна прызнаць, што ён застаўся так ці інакш суб'ектам палітыкі. Намер Мядзведзева пазбавіцца да кагорты палітыкаў-аксакалаў кшталту Лужкова або Шайміева, не спрацаваў. У выпадку дэстабілізацыі сітуацыі, яны маюць шанец імкліва зноў стаць моцнымі палітычнымі гульцамі.

З НАГОДЫ

# ВЫБАРЫ ЎСІХ СВЯТЫХ

**Сёлета ва Украіне свята Хэлоўін прыйшлося на мясцовыя выбары, якія, як лічаць палітолагі, вызначылі контуры палітычнага развіцця краіны на бліжэйшы час. Пра сітуацыю пасля выбараў журналісту «НЧ» Алегу Новікаву распавядае кіеўскі палітолаг Юры Дакукін.**

## Пра агульныя вынікі галасавання

На жаль, на гэты момант дакладных дадзеных выбараў яшчэ няма. Але некаторыя асаблівыя моманты ўжо відавочныя. Экзіт-полы даюць вялікі паказчык пратэстнага галасавання. Выбаршчыкі не толькі казалі прадстаўнікам сацыялагічных агенцтваў, што абралі пункт «Супраць усіх», адзначана шмат выпадкаў, калі на ўчастках дэманстратыўна рвалі бюлетэні, хоць за гэта прадугледжваецца адміністратыўнае пакаранне. У Палтаўскай вобласці нейкі юнак адмыслова наванітаваў у ўрну для галасавання.

Другі момант — гэта падзенне яўкі з 60 працэнтаў на папярэдніх выбарах да 30–40 працэнтаў.

Галоўным чынам апатыяй абхоплены Усход, што моцна ўдарыла па Партыі рэгіёнаў. Затое гэта дазволіла зрабіць прарыў камуністам, чый электарат — пенсіянеры — традыцыйна ходзіць на выбары.

## Пра фальсіфікацыі

Фальсіфікацыі былі на ўсіх выбарах. Заўсёды існавалі партыя ўлады і адміністратыўны рэсурс, аднак быў і працэнт людзей, якія галасавалі за ўладу. Для Украіны ціск на канкурэнтаў напярэдадні выбараў — таксама норма. Аднак падтасоўкі і пагрозы працаўнікам — гэта не вырашальны фактар, як паказалі самі вынікі выбараў. У тым жа Крыму Партыя рэгіёнаў, нягледзячы на вельмі актыўны ціск на супернікаў, выступіла дастаткова кепска.

## Пра вяртанне Сацпартыі

Апошні час за сацыялістамі замацаваўся імідж партыі трэцяга эшалона. Нечакана СПУ пачала набіраць папулярнасць. У «рэгіяналаў», здаецца, паўстала праблема адтоку выбаршчыкаў. Задача была ў тым, каб гэтыя галасы ішлі не камуністам, а да іншай кантраляванай бела-сінімі левай партыі. Лепшага варыянту, чым СПУ, папросту няма. Гэты праект адкаталі на выбарах. Старшыні СПУ трэба было прадэманстраваць добрыя паказчыкі, каб праз два гады на выбарах у парламент у яго ўклалі грошы. Сёння СПУ ў шэрагу абласцей можа наваt трапіць у аблсаветы.

**Для Партыі рэгіёнаў вельмі важна даціснуць Цімашэнка, каб не паўтарылася сітуацыя 2004 года, калі змена ўлады значыла пагрозу забароны партыі**

## Пра аб'яднанне «Свабода»

За гады незалежнасці аб'ектыўна паўстаў правы электарат. Ён разгубіўся ў часы кіравання Юшчанкі і Цімашэнка. Партыя рэгіёнаў пралічыла, што група можа выканаць карысную функцыю — разбурыць «аранжавы» партыйны фланг, і дала Цягнібоку (старшыня «Свабоды») рэсурсы. Задачу ён выканаў. Па выніках гэтых выбараў у «Свабоды» з'явіліся фракцыі ў Жытомірскай і Кіеўскай абласцях, што амаль фантастычна. «Свабода», можна сказаць, напярэдадні праходжання ў парламент. Паколькі прыйшло шмат былых «аранжавых», хутчэй за ўсё, Аб'яднанне трохі зменіць імідж, будзе рухацца ў бок умераных правых. Яно стане ўкраінскім варыянтам партыі Ле Пена.

## Пра КПУ

КПУ святкуе перамогу. За кошт падзення яўкі прыхільнікаў Партыі рэгіёнаў яны апынуліся ў плюсе. Характэрная сітуацыя ў Луганску, дзе камуністы ніколі не набіралі больш 6–7 працэнтаў, хоць выбудоўвалі самыя вар'яцкія камбінацыі з бізнес-структурамі. А зараз яны вядуць барацьбу прынамсі за другое месца. Тое ж самае адбываецца ў Севастопалі, дзе КПУ скокнула з 3 да 19 працэнтаў. КПУ даказала, што мае стабільны электарат каля 9 працэнтаў. Зараз «рэгіяналам» давядзецца з імі лічыцца.

## Пра Партыю рэгіёнаў

У цэлым Партыя рэгіёнаў палепшыла сваё прадстаўніцтва, але ў асобных выпадках (напрыклад, у Севастопалі) страціла галасы. Партыя паказала, што яна досыць цэментаваная. Пры гэтым, аднак, Партыя рэгіёнаў не вырашыла галоўнай праблемы — яна застаецца рэгіянальнай партыяй, хоць хацела б быць нацыянальнай.

## Пра партыі мясцовых эліт

З-за расчаравання ў старых партыйных брэндах мясцовыя эліты ахвотна выкарыстоўвалі новыя. Для гэтага яны перакуплялі партыі, якія існавалі фармальна, на паперы, і баламаваліся пад іх сцягамі. Самы вялікі поспех мела партыя «Сумленне Украіны». Дагэтуль яе ведалі толькі дзякуючы таму, што яе кандыдатам на якіхсьці выбарах была жанчына, якую 40 разоў затрымлівалі за прастытуцыю. Зараз «Сумленне Украіны» прысутнічае ў аблсаветах Вінніцкай і Палтаўскай абласцей. Такіх прыкладаў вельмі шмат. Ідзе пошук брэндаў, якія сябе не дыскрэдытавалі. Увогуле, выбары паказалі, што ўсё больш развіваецца рэгіяналізацыя. Феномен, калі ў адной вобласці якая-небудзь партыя набірае завоблачную суму галасоў, а ў суседняй мізер.

## Пра новыя твары ўкраінскай палітыкі

Цігіпка вельмі моцна прайграў. Калі б ён набраў з нуля такую суму, як цяпер (5–6 працэнтаў), — гэта быў прарыў. Але зараз — правал. Хутчэй за ўсё, зноў адыграла сваю ролю тое, што ён патрапіў ва ўладу, і нічога пасля гэтага не змянілася. Электарат патрабуе дынамікі.

А ў Яцэнюка — свята. Ягоны «Фронт перамен» набраў 7 працэнтаў. Вакол яго будуць групавацца ўмераныя правыя, і ў яго добры шанец патрапіць у парламент.

## Пра партыю «Бацькаўшчына»

У партыі «Бацькаўшчына» (старшыня Юлія Цімашэнка) Партыя рэгіёнаў бачыла свайго асноўнага ворага, і супраць яе быў першым чынам накіраваны адміністратыўны рэсурс. Для Партыі рэгіёнаў вельмі важна даціснуць Цімашэнка, каб не паўтарылася сітуацыя 2004 года, калі змена ўлады значыла пагрозу забароны Партыі рэгіёнаў і праблемы для блізкіх да яе бізнесменаў. Толькі Цімашэнка здольная на такі ход. У прынцыпе, «Бацькаўшчына» выстаяла, але 13 працэнтаў падтрымкі — гэта слабы вынік для Юліі. Спонсары хутчэй умацаваліся ў думцы, што праект Цімашэнка пакуль у стадыі заняпаду. І яшчэ адзін трывожны званок: у Чарнігаўскай вобласці (традыцыйная вотчына БЮТ), перамаглі «рэгіяналы».

## Пра будучыню аранжавай апазіцыі

Выбары сталі пахавальным звонам па аранжавых. Клічко наогул адмовіўся ад іміджу палітыка з Майдану. Юшчанка сабраў каля двух працэнтаў. Партыі, якія ўваходзілі ў Саюз «Наша Украіна», і таго менш. Луцэнка наогул не ўдзельнічаў у выбарах. Той факт, што «Бацькаўшчына» не змагла значна абысці Яцэнюка, азначае адсутнасць у правым лагеры прызнанага лідэра. На парламенцкія выбары партыі пойдуць паасобку. Будзе 2–3 цэнтры прыцягнення. Паколькі іх сілы прыкладна аднолькавыя, для «рэгіяналаў» гэта не моцны супернік.

## Пра перспектывы

Пакуль у краіне назіраецца дэпалітызацыя, хоць чыннікі для пратэстнага рэсурсу ёсць. Цяпер варта чакаць перастановак ва ўрадзе — следства правалу Літвіна і ўздыму камуністаў. Магчыма ўключэнне ў кааліцыю Яцэнюка. Многае будзе залежаць ад рэакцыі насельніцтва на падвышэнне коштаў на камунальныя паслугі. Рэформа вось-вось пачнецца і напэўна будзе мець палітычныя наступствы, якія пакуль цяжка пралічыць.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР КАЗЛОЎ



Казлоў — казахскі апазіцыйны палітык, які сенсацыйна абвясціў пра намер балатавацца на пасаду прэзідэнта краіны ў 2012 годзе. Не паспеў Казлоў агучыць інфармацыю пра свой намер, як тут жа быў атакаваны мясцовымі нацыяналістамі. 27 кастрычніка група актывістаў руху «Жэлкастан 86» (удзельнікі антысавецкіх студэнцкіх пратэстаў 1986 года) прыйшла на прэс-канферэнцыю Казлова і закідала яго і паплечнікаў пластыкавымі бутэлькамі і яйкамі. Яны запатрабавалі ад Казлова не выстаўляць сваю кандыдатуру на пасаду прэзідэнта Казахстана, паколькі ён «не з'яўляецца прадстаўніком казахскай нацыянальнасці». Зараз палітыкум спрачаецца наконт таго, хто стаяў за правакацыяй. Справа ў тым, што нацыяналісты асудзілі атаку на Казлова. Іх лідэр Мухтар Шаханаў кажа, што, «Жэлкастан 86» — гэта цацка спецслужбаў. Па яго словах, калі Казлоў здасць іспыт на веданне казахскай мовы, перашкод на вылучэнне яго ў прэзідэнты няма. З іншага боку, адным з тых, хто атакаваў Казлова быў Талгат Рыскулбекаў — родны брат героя падзей 1986-га Кайрата Рыскулбекава (студэнт Кайрат Рыскулбекаў загінуў у савецкай турме пры не высветленых да канца абставінах, ён павесіўся, калі даведаўся, што яго не апраўдалі, замяніўшы расстрэл дваццаццю гадамі турмы). Постаць Кайрата Рыскулбекава культавая сярод нацыяналістаў.

### ПЕТРА ПАЎ



Дэпутат бундэстагу ад партыі Левыя выступіла з ініцыятывай, якая супярэчыць фундаментальным прынцыпам Асноўнага закону ФРГ. Петра ў рамках каментару на апошнія канфлікты грамадства і дзяржавы (дэманстрацыі супраць АЭС і праекту рэканструкцыі вакзалу ў Штутгарце), заклікала вярнуць у Канстытуцыю краіны пункт пра рэферэндум. На яе думку, плебісцыты вернуць народу права вырашаць лёс краіны. Адмова ад прынцыпу наўпроставай дэмакратыі, па словах Паў, сведчыць пра тое, што Германія належыць да катэгорыі краін Трэцяга свету. Праблема, аднак, у тым, што аўтары Канстытуцыі Германіі асобным пунктам забаранілі правядзенне ўсеагульных апытанняў насельніцтва, памятаючы, што такая практыка была вельмі папулярнай у Трэцім рэйху. У часы Гітлера ў Германіі мелі месца пяць рэферэндумаў. Цікавая рэакцыя грамадства на прапанову Петры. Большасць нямецкіх палітолагаў згодныя з Паў наконт таго, што нямецкая палітычная культура з 1930-х гадоў змянілася, і нічога страшнага ў плебісцытах няма. Але пры гэтым яны супраць іх правядзення, паколькі аўтаматычна ставіцца пад пытанне іншы пункт цяперашняй Канстытуцыі. Стваральнікі ФРГ увялі пяціпрацэнтны прахадны бар'ер у парламент для партый. У выніку перагляду Асноўнага закону можа быць зменены і гэты раздзел. У такам выпадку ў Бундэстаг змогуць лёгка прыходзіць радыкальныя правыя партыі, якія звычайна збіраюць 2–3 працэнты на выбарах.

### ДЖОН КЕЙ

Прэм'ер-міністр Новай Зеландыі асабіста змагаўся з кіраўнікамі кампаніі «Warner Brothers» за тое, каб здымкі фільму «Хобіт» (экранізацыя вядомага рамана Джона Толкіена) праходзілі ў Новай Зеландыі. Нагадаем, што менавіта тут былі знятыя ўсе фільмы трылогіі «Уладальнік кальца». Новы праект каштуе 1,5 мільярда долараў і мог бы заняць некалькі тысяч жыхароў краіны, што вельмі патрэбна ураду. Падчас здымкаў трылогіі дзякуючы інвестыцыям кінакампаніі кожны жыхар краіны атрымаў па 350 долараў. Праблема, аднак, у тым, што кампанія патрабавала спецыяльны прававы статус. Так, яна вызвалялася ад некаторых падаткаў, а новазеландцам, якія будуць занятыя на здымках, забаронена праводзіць страйкі. Такі пункт супярэчыць заканадаўству. Таму 28 кастрычніка Джон Кей быў вымушаны прымаць спецыяльную пастанову ўраду пра дзейнасць кампаніі «Warner Brothers» у краіне. Гэта прывяло да пратэстаў левай апазіцыі. Яе лідэр заявіў, што Галівуд стварае прававы прэцэдэнт для разбурэння сацыяльнай сістэмы і прафсаюзнага руху. Дасталася і «Хобіту». Левыя кажуць, што ў выніку экранізацыі хобіт стане сімвалам нацыі.



▸ СПАДЧЫНА

# БЕЛАРУСКАМУ ФАЎСТУ 305 ГАДОЎ…

Аляксей ХАДЫКА

**Старадаўняе паданне пра чалавека, які прадаў душу д'яблу, нарадзілася яшчэ ў раннехрысціянскія часы ў «навагрэчаскай» літаратуры ў выглядзе «Аповесці пра Еладзія». Але ў еўрапейскай традыцыі ўчалавечылася праз вобраз вандроўнага нямецкага алхіміка Іагана Фаўста, ураджэнца Кнітлінгена, які жыў прыкладна ў 1480–1540 гадах. А ці ёсць водгукі фаўстаўскай гісторыі ў беларускай мінуўшчыне? Можа, невыпадкова Гётэ цаніў менавіта першую, беларускую оперную пастаноўку свайго неўміручага твора?**

## Пралог

Марцін Мікалай Радзівіл нарадзіўся 11 лістапада 1705 года ў Цімкавічах, у сям'і навагрудскага ваяводы Яна Мікалая і Дароты Генрыкі з Пшэбендоўскіх.

Цяжка сказаць, калі Марцін Мікалай даведаўся пра чарнакніжніка Фаўста. Магчыма, калі выправіўся ў Еўропу па навуку пасля вучобы ў Нясвіжы і Вільні каля 1720 года. Азнаёміўся з фізікай, хіміяй, прыродазнаўчымі дысцыплінамі, зацікавіўся алхіміяй. Навучыўся граць на шэрагу музычных інструментаў. А можа, ён убачыў захаваны і да сёння жывапісны партрэт Іагана Фаўста ў Дрэздэне, куды выбраўся разам з Тэадорам Любамірскім у 1743 годзе да саксонскага двара ў справе падрыхтоўкі чарговага сойму Рэчы Паспалітай.

## Прыватнае жыццё

Паміж гэтымі падзеямі здарылася яшчэ шмат чаго. Цёплы прыём на каралеўскім двары Аўгуста II у Варшаве і наданне каралём юнаку тытула літоўскага крайчага. Пазней — даўжэйшы побыт пры двары і шлюб у 1728 годзе з Антанінай Белхацкай, унучкай Вацлава Патоцкага гербу «Шранява», аўтара вядомага твору «Хоцімская вайна».

Кар'ера Радзівіла далей мела больш прыватны характар: нарадзіліся дачка і сын. Па смерці бацькі наш герой пераважна жыў у ВКЛ, заняўшы клецкую ардынацыю Радзівілаў. Класічны палац у Радзівілімонтах, зусім нядаўна знішчаны праз нацыянальную беларускую нядбайнасць, зрабіўся хатнім гняздом для сына Марціна, Юзафа Мікалая (1736–1813), у той час як бацька асеў у старасвецкім Чарнаўчыцкім палацы.

Адзіным яскравым эпізодам грамадска-палітычнай актыўнасці князя было яго абранне ў Трыбунал ад слуцкага павета ў 1737 годзе, дзе Марціну Мікалаю давялося маршалкаваць. У тым самым годзе ён ажаніўся ў другі раз, паколькі годам раней у Кракаве, праз тыдзень па нараджэнні хлопца, яго першая жонка памерла. Другой абранніцай, што народзіць яму чатырох сыноў і пражыве з ім доўгае жыццё аж да 1812 года, стала дачка бельскага падчашага Яна Трэмбіцкага Марта.



Марцін Мікалай Радзівіл (1705–1782) на гравюры Марціна Францішка Вобе, перад 1758 г.



Фрагмент праекта палаца ў Чарнаўчыцах, XVII ст.




Доктар Іаган Фаўст (1480–1540), нямецкі партрэт сярэдзіны XVII ст.



Геранім Фларыян Радзівіл (1715–1760) на партрэце Якуба Вессэля, каля 1746

Дарэчы, сям'я ўспрыняла гэты шлюб як мезальянс, але ўздыхнула з палёгкай. У князя перад тым надарыўся раман з дваровай дзеўкай, ад якога «здарыліся» дзеткі, так што Марцін Мікалай, як чалавек сумленны, збіраўся з ёй ажаніцца і нават прасіў на тое дазвол у віленскага біскупа.

## Загадкавыя перамены

Надышлі 1840-я гады, самы загадкавы перыяд гісторыі крайчага. Па ВКЛ папаўзлі чуткі, што заможны пан не проста захапіўся фізічнымі і хімічнымі эксперыментамі. Апантаны зоркай алхіміі, ён спрабаваў здабыць філасофскі камень. І нават больш за тое: заглыблены ў роздумы і пошукі, ён з хрысціянства навярнуўся на старажытнаегіпецкі «метапсіхоз» — увераваў у перасяленне душаў і шматстадыйнасць жыцця і ўвасабленняў. Нарэшце, ахоплены надчалавечым гонарам, ён вырашыў абраць сабе новую рэлігію са шматлікіх існых. Выбар паў на іудаізм.

Вынікам зрабілася выгнанне з двара хрысціян. Князь абкружыў сябе габрэямі на чале з некім Шыманам, вучыў асновы рэлігіі і ідыш. Лад жыцця князь вёў кашэрны, шанаваў шабаты, на якіх, частуючы свой новы двор шчупакамі з локшынай і кугелем (бульбай з курацінай на габрэйскі густ), сядзеў у лапсардаку з ордэнам св. Губерта на шыі.

Здабыванне філасофскага каменю патрабавала кансультацый калег. Аднойчы, запрасіўшы да сябе доктара Брэскага з Любліна на тыдзень, князь затрымаў яго гвалтам на паўгода. Небараку выратаваў візіт мемуарыста шляхціца Матушэвіча. Але Мікалай Марцін выслаў за доктарам пагоню ў 100 вершнікаў, якія нагналі яго ў Берасці і прымусілі хавацца ў езуіцкім калегіўме. З-пад аблогі люблінскі вучоны збег, пераапрануўшыся езуітам у суправаджэнні сапраўднага законніка.

Дзівацтвы князя не абмежаваліся навукай і выбарам веры. Незадаволеныя гаспадаром рабіліся прадметам яго шалёных нападаў, зброяй якіх быў адзін з княжацкіх дворных «кліентаў» шляхціц Грабоўскі. Той ладзіў падпалы майна непрыяцеляў, рабаўніцтвы на дарогах, нават забойствы. У карчме быў зарэзаны брэсцкі падсудак Збароўскі, забіты шляхціц Кукоўскі з жонкай. Нарэшце, у 1748 годзе сам князь загадаў арыштаваць свайго клецкага плябана Сузіна і па абвінавачанні ў распусце даставіць скутага на суд віленскага біскупа Зянковіча. У апошняга хапіла разважлівасці адразу вызваліць палоннага.

## Пад прысудам грамадства

У шляхты скончылася трыванне. Грабоўскага, ужо завочна асуджанага на «кару горлам», схапілі, калі ён спрабаваў пагражаць брэсцкаму гараднічаму, і пакаралі смерцю ў Пётркаве. А пратэстацыю шляхты на князя з брэсцкага сойміка павезлі каралю Аўгусту III брат клецкага плябана аршанскі падстолі Сузін і земскі пісар Бухавецкі. Казалі, каралева Марыя Юзэфа, пачуўшы пра справу, абяцала пакрыўджаным сваю пратэкцыю. Запахла скандалам. І хаця краіна жыла (паводле Энгельса), шляхецкім беспарадкам, намеціўся трыумф права.

Сітуацыю абцяжарвала яшчэ адно дзівацтва Марціна Мікалая. Замкнуўшы пад замок сваю жонку з дзецьмі, у апошнія некалькі гадоў ён абкружыў сябе сапраўдным гарэмам. Наложніц кралі, куплялі ў бедных мацярок, некаторых пастаўлялі інфармаваныя дабразычліўцы. Усплыла скандальная гісторыя давыдгарадоцкага плябана, які за 200 дукатаў накіраваў мясцовую прыгажуню Марціну Мікалаю. Гарэм жыў нябедна: жанчыны насілі шыкоўныя сукенкі, атрымлівалі ад князя клейноты з каштоўнымі камянямі.

Адным словам, у высакароднай сям'і запахла скандалам. Зводная цётка Марціна Мікалая, знакамітая заснавальніца шматлікіх радзівілаўскіх мануфактур (дарэчы, і фарфурняў, а фарфор, як вядома, таксама вынаходніцтва аднаго еўрапейскага алхіміка), Ганна з Сангушкаў, пісала свайму сыну Гераніму Фларыяну: «Досыць пан Бог укараў наш дом непапраўнай плямай, крайчым Радзівілам, які цалкам Бога пакінуўшы і забыўшыся на Яго, з курвамі жывучы, жонку сваю адрынуў, адно стаўшы насмешкаю перад цэлым светам Рэчы Паспалітай» (ліст з Белай, пісаны 5 мая 1735 года).

## Зняволенне

Каб замяць справу, аматар муз вялікі гетман Міхал Казімір «Рыбанька», вядомы сваёй жорсткасцю, кадэцкімі карпусамі ў Белай і тэатрам у Слуцку, харунжы Геранім Фларыян (антыгерой «Маці ўрагану» У. Караткевіча, ад якога ў рэальным жыцці збеглі 3 жонкі) і навагрудскі ваявода з «дзятлаўскай лініі» Юры Радзівіл звярнуліся да караля аддаць ім Марціна Мікалая «пад куратарства». І свайго дабіліся.

Дзеля заключэння вар'ята пад варту Гераніму Фларыяну давялося штурмаваць Чарнаўчыцы з 200 вершнікамі. Габрэяў разагналі, прастытутак, адабраўшы каштоўнасці, адправілі па хатах. Распараджэнне дабротамі перайшло Гераніму Фларыяну (да смерці яго ў 1760 годзе), затым «Рыбаньку», а затым сынам зняволенага. Жонцы і сынам прызначылі невялікую рэнту. А турмой Марціну Мікалаю зрабіўся спачатку Бельскі, а затым Слуцкі замак.

Нявольнік не адышоў ад іудаізму, а над сваімі наглядчыкамі, здаецца, здзекаваўся. У час рэдкага адведвання Геранімам Фларыянам былы прыхільнік «метапсыхозу» паведаміў, што ў папярэднім жыцці, паколькі мае доўгі нос, быў птушкай, кулікам, а ў наступным будзе сланом. На пытанне пра свой будучы лёс Гераніму Фларыяну паабяцаў пераўтварэнне ў кабана — «на міласць здзейсненага ім срамнага бруду»…

Толькі «Рыбанька» пасля 1760 года трохі палепшыў харчаванне і ўмовы ўтрымання вязня, якому дазволілі прагулкі па валах Слуцкага замка пад вартай. На дзіва, жонка не забылася на мужа і хадайнічала пра яго вызваленне перад «Рыбанькам», а сам Мікалай Марцін звяртаўся ў гэтай справе да Станіслава Аўгуста ў 1765 годзе. Дарэмна.

Ішоў час, у 1752 годзе вязень адмовіўся ад тытула крайчага. У тым жа годзе слуцкія дакументы паведамляюць пра ўдзел аднаго з яго сыноў у палацавым спектаклі, у якім ён на нямецкай мове выступаў у ролі «гішпанскага князя».

## Эпілог

Што зрабілася прычынай відавочнага вар'яцтва Мікалая Марціна, сказаць цяжка. Краіна шляхецкай вольнасці імкліва каціласа да заняпаду. Першы падзел Рэчы Паспалітай наш герой перажыў на 10 гадоў і памёр 18 сакавіка 1782 года ў Слуцку.

Занядбаны аднапавярховы чарнаўчыцкі палац у 1819 годзе наведваў Юльян Урсын Нямцэвіч, адзначыўшы вялікі памер пакояў, куды магла «заехаць шасціконная карэта», а таксама дасканалы парк за палацам і звярынец. Пры маёнтку захоўвалася вялікая калекцыя старасвецкіх вазкоў «часоў да Патопу».

З пяці сыноў і адной дачкі ад двух шлюбаў Марціна Мікалая толькі адзін, наймалодшы Якуб (1748–1808) цярпеў на псіхічнае расстройства. Старэйшы, Міхал Юзаф (1736–1813), быў навагрудскім ваяводам, старэйшы ад другога шлюбу Антоні (1741–1778) — святаром і віленскім канонікам.

А ўнук Марціна ад трэцяга сына Міхала Гераніма (1744–1831), віленскага ваяводы, Антоні Генрык (1775–1833), намеснік Вялікага княства Познанскага і нясвіжскі ардынат, увасобіў у культурнае жыццё фаўстаўскія матывы лёсу свайго дзеда. Менавіта ён праславіўся як музыка і кампазітар, сябра Гётэ, які стварыў першую і адзіную прызнаную нямецкім пятам вартаснай оперную версію «Фаўста».

У Чарнаўчыцах у царкве захоўваўся выдатны, датаваны 1729 годам, уніяцкі абраз «Цуд св. Георгія аб змеі», які відавочна ўзнік у часы, калі малады Марцін Мікалай знаходзіўся яшчэ ў добрым розуме. Магчыма, князь бачыў гэты твор, уключаны ў 6-томнае акадэмічнае выданне «Гісторыі беларускага мастацтва».

Доктар Фаўст, паводле падання, загадкава загінуў ноччу ў гасціным двары ў Віртэмбэрзе ў 1540 годзе. Людзі чулі тупат ног, гукі мэблі, якая валілася ў пакоі, а на раніцу знайшлі знявечанае цела Фаўста. Кажуць, Мефістофель, які заключыў з Фаўстам пагадненне на 24 гады, забраў яго душу.

А беларускі абраз, які бачыў Марцін Мікалай Радзівіл, згарэў на мяжы XX і XXI стагоддзяў. Як многае ў гэтай краіне, пайшоў з дымам. Так і ўяўляецца навальнічная ноч, маланка, якая запальвае храм. Няхай «Беларусьфільм» лічыць гэты артыкул сцэнарнай заяўкай на нацыянальны «фаўстхорар». Фільм павінен пачынацца з раптоўнага і загадкавага візіту слана на прэм'еру «Фаўста» Антоні Радзівіла.

З НАГОДЫ

# СТВАРАЛЬНІКІ АНІМАЦЫЙНАГА СУСВЕТУ

Алесь ЛАПО

**28 кастрычніка 1892 года парыжскую публіку зачаравалі жывыя малюнкі Эміля Рэйно, і сёння гэта дата — Сусветны дзень анімацыі. Аднак мала хто ўзгадвае, што праз два дзесяцігоддзі мастак-вынаходнік свой праекцыйны апарат і плёнку выкінуў у Сену. А што з беларускай анімацыяй?**

## Ад кастрычніка да аўтарскай анімацыі

Адлік свайго існавання беларуская анімацыя распачала з другой паловы 1920-х гадоў, калі на экраны выйшаў мультфільм «Кастрычнік і буржуазны свет». Стваральнікі мультыплікацыйнага першынца выканалі яго ў выяўленчых традыцыях плакатаў і палітычных карыкатур. Стужка была прысвечана дзесяцігоддзю паслярэвалюцыйнага развіцця савецкай дзяржавы. Адпавядаў патрабаванням прапаганды нескладаны сюжэт эксперыментальнага фільма: манументальныя постаці селяніна і рабочага, счапіўшыся за рукі, раструшчваюць шматгаловую змяю, што пагражае небяспецы маладой дзяржавы.

У наступныя пяцьдзесят гадоў анімацыйных фільмаў на беларускай кінастудыі не рабілі, і толькі ў 1973-м на «Беларусьфільме» ўтвараецца мультыплікацыйная студыя. У гэты час з’яўляецца разуменне таго, што асноўнай мэтай анімацыі ёсць не прапаганда савецкіх дасягненняў, а выхаванне дзяцей і юнакоў. Вось толькі поспехаў у жанры масавага дзіцячага кіно айчынныя аніматары не дасягнулі.

Выратавала элітарная мультыплікацыя: з другой паловы 1980-х на кінастудыі з’явіліся творы з адметным аўтарскім почыркам — «Капрычыа» І. Волчака, «Лафертаўская макаўніца» А. Пяткевіч. Фільмы менавіта такога кшталту прынясуць сусветную фестывальную вядомасць студыі анімацыйных фільмаў «Беларусьфільма». Вось толькі беларускі глядач увесь гэты час заставаўся з носам: такой анімацыі закрыты шлях у тэлеэфір, не кажучы ўжо пра кінатэатры.

## Настаўнік аніматараў

Сённяшні калектыў аніматараў уважліва ставіцца да вытворчасці аўтарскага і масавага дзіцячага мультыплікацыйнага кіно, імкнецца да спалучэння абодвух характарыстык. Прыхільнікам апошняга падыходу з’яўляецца творчы натхняльнік і настаўнік большасці рэжысёраў і мастакоў студыі Ігар Волчак. Ён быў кампазітарам першага беларускага пасляваеннага анімацыйнага фільма «Хлопчык і птушка», і справа настолькі яго захапіла, што ён прысвяціў ёй жыццё.

З юнацкай апантанасцю мэтр беларускай анімацыі курыруе адразу тры праекта: шматсерыйныя фільмы «Несцерка» і «Аповесць мінулых гадоў» і стужку пра кампазітара Сяргея Пракоф’ева з беларуска-расійскага мультыплікацыйнага цыклу «Казкі старога піяніна».


Несцерка

Пра апошні праект казаць яшчэ рана: ён знаходзіцца ў вытворчасці, а вось серыі першых двух ужо паспелі здабыць і фестывальнае, і глядацкае прызнанне. Фільм «Несцерка» — гэта спроба з персанажа беларускага фальклору, які актыўна выкарыстоўваецца ў літаратуры і тэатры, стварыць нацыянальнага анімацыйнага героя, накшталт Чабурашкі ці Мікі Маўса. Кемлівы Несцерка, які пры дапамозе верных сяброў Ката і Сабакі з гумарам вырашае праблемы, што ўзнікаюць перад ім, будзе даспадобы шырокай дзіцячай аўдыторыі.

Праект «Аповесць мінулых гадоў» яшчэ больш значны, таму ў ім задзейнічаны ўвесь студыйны склад аніматараў. У фільме ў цікавай і дасціпнай форме распавядаецца гісторыя паходжання гербаў беларускіх гарадоў. Ілюстратарамі кожнага сюжэта з’яўляюцца розныя аўтары, таму анімацыя атрымалася стылістычна рознабаковай, што падкрэслівае разнароднасць таленту беларускіх майстроў. Невыпадкова менавіта гэты фільм быў прызнаны лепшым айчынным творам анімацыі на Брэсцкім фестывалі фільмаў–2010 і шчодра адзначаны на міжнародных фэстах.

Абодва шматсерыйныя праекта беларускамоўныя, і іх плануецца прадоўжыць да поўнаметражнага фармату, што адкрые фільмам большыя магчымасці ў ратацыі на тэлеканалах і ў кінатэатрах.

Волчак прыгожа падкрэслівае, што, хоць тутэйшых каранёў і не мае, аднак пра стан нацыянальнай культуры непакоіцца: «Я быў прывіты да Беларускага дрэва ў 1953 годзе, з тых часоў даў новыя парасткі і нават плады. Любая ж крона, лістота, каб не ссохнуць, павінна памятаць пра свае карані, сваё паходжанне».

## Парасткі мультыплікацыі

Сярод прыхільнікаў роднай мовы і фальклору на студыі вылучаецца Міхаіл Тумеля. Яго апошнія фільмы стылізаваны пад тэхніку беларускай выцінанкі, агучаны кампазіцыямі этна-трыа «Троіца» і аднаўляюць фальклорны свет беларускіх прымавак. Дасціпныя беларускія выказванні кшталту «Чорт чорта пазнаў ды на піва пазваў», ці «Бог не цяля — бачыць круцяля», дзякуючы фантазіі М. Тумелі знайшлі сваё адлюстраванне ў сюжэтах анімацыйнага фільма з працягам «Беларускія прымаўкі».

Дынамічная анімацыя «Выцінанка-выразанка» прысвячаецца Вячаславу Дубінку, адраджэнцу на беларускай зямлі майстэрства мастацкага выразання з паперы. Вось толькі ўспрымаецца мультыплікацыя як некралог — знаны майстра не так даўно адышоў у лепшы свет.

Шматсерыйны праект аніматара Аляксандра Ленкіна «Прыгоды рэактыўнага парася» будзе даспадобы дашкалятам і малодшым школьнікам, а лірычная драма «Птаха» прывабіць старэйшае пакаленне. Простая гісторыя пра старэнькага вяскоўца, які толькі напрыканцы жыцця зразумеў, што такое любоў, кранае ледзьве не да слёз.

З прызнаных майстроў на студыі анімацыйнага кіно працуюць Ірына Кадзюкова, Алена і Уладзімір Пяткевічы, расце падмацаванне з маладога пакалення — Наталля Хаткевіч і Марына Карпава. З верай у будучае глядзіць і І. Волчак: «Анімацыя не павінна разглядацца як справа камерцыйная, яна вышэй за таварна-грашовыя адносіны, вышэй касавага кіно, бо працуе на будучыню — на новыя пакаленні, і таму павінна несці за сабой дабрыню і гуманізм».

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# СПАДЧЫНА ЎСЁЙ ЕЎРОПЫ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Новую кнігу Змітра Сасноўскага «Гісторыя беларускай музычнай культуры ад старажытнасці да канца XVIII ст.» можна з упэўненасцю назваць сайд-праектам вядомага музыканта і кіраўніка гурта «Стары Ольса».**

Гэтае выданне з’явілася не ў апошнюю чаргу таму, што Зміцер, як прафесійны гісторык і даследчык старажытных інструментаў, вывучаў вялікую колькасць гістарычнага матэрыялу, які быў прысвечаны самым старажытным старонкам айчыннай музычнай культуры для выкарыстання іх у музычнай практыцы свайго гурта. У выніку цікавага і арыгінальнага матэрыялу назбіралася столькі, што ідэя стварыць першы падручнік па музычнай культуры набыла рэальныя формы. Кніга стала своеасаблівай музычнай энцыклапедыяй з вялікай колькасцю нідзе не апублікаваных звестак і ўнікальнага іканаграфічнага матэрыялу.

Кніга Змітра Сасноўскага з’явілася на свет у выдавецтве «Харвест» у папулярнай серыі «Неизвестная история», якую заснаваў вядомы беларускі пісьменнік і выдавец Анатоль Тарас. Як адзначыў спадар Тарас на прэс-канферэнцыі, гэта першае выданне яго серыі па-беларуску.

Зміцер Сасноўскі прызнаўся, што з хваляваннем чакае водгукаў на сваю кнігу ад прафесіяналаў-музыказнаўцаў. Асабліва што тычыцца храналогіі гісторыі беларускай музыкі. У кнізе прапанавана аўтарская канцэпцыя гэтай храналогіі, якая шмат у чым адпавядае храналогіі станаўлення дзяржаўнасці нашай краіны. І тым не менш, кніга і яе гістарычная канцэпцыя адкрытыя для абмеркавання і зацікаўленай крытыкі.

«Гісторыя беларускай музычнай культуры ад старажытнасці да канца XVIII ст.» — гэта і своеасаблівы даведнік. У ім змешчаны шмат дадатковых матэрыялаў. Напрыклад, беларускі тэкст гімна «Багародзіца», а таксама васьмімоўны даведнік назваў музычных інструментаў з іх малюнкамі. У кнізе змешчаны пераклад унікальнага музыказнаўчага эсэ аўстрыйскага дырыжора і даследчыка старадаўняй музыкі Нікалаўса Арнанкурта «Музыка як мова гукаў», якую ўпершыню па-беларуску пераклаў Зміцер. Гэты твор — сапраўдны праваднік у свет старажытнасці, дапаможнік выканаўцам музыкі мінулых стагоддзяў.




Пра энцыклапедычнасць новай працы З. Сасноўскага можна меркаваць і па тым, з якой пашанай і піетэтам аўтар ставіцца да цудам дайшоўшых да нас беларускіх нотных зборнікаў: «Полацкага сшытка», «Курантаў», «Нясвіжскага канцыялу», узораў народнай і прафесійнай музычнай творчасці кампазітараў Яна Давыда Голанда, Вацлава з Шамотул, Міхала Казіміра Агінскага і іншых творцаў. Але ў кнізе адчуваюцца і прыхільнасці аўтары. І гэта, зразумела, унікальны інструмент, на якім Зміцер Сасноўскі грае ў гурце «Стары Ольса» — беларуская дуда. Менавіта гэтаму інструменту ў кнізе адведзены цэлы раздзел, які аўтарам названы «Іканаграфія беларускіх дудаў XIX–XX стст.», шмат візуальных матэрыялаў для якога Зміцер знайшоў падчас працы ў Дзяржаўным архіве фота і кінадакументаў у Дзяржынску.

Акрамя цэлага комплексу сенсацыйных звестак па гісторыі беларускай музычнай культуры, кніга Змітра Сасноўскага — яшчэ і захапляльнае чытво, накшталт раманаў Уладзіміра Караткевіча: тут ёсць і гістарычныя загадкі, археаграфічныя даследаванні і высновы на іх падставе, а таксама відавочныя доказы таго, наколькі багатай была музычная культура беларускіх земель — неад’емнай часткі Еўропы.

## ВЫСТАВЫ

# ПАВОДЛЕ ЧАСУ

**Ёсць рэдкія выпадкі, калі асоба, якая займае высокую адміністрацыйную пасаду ў творчым саюзе, тым не менш захоўвае цалкам свежае мастацкае бачанне свету і майстэрскі творчы ўзровень. Да іх ліку можна аднесці аднаго з кіраўнікоў Саюза мастакоў Беларусі Сяргея Цімохава.**

Яго выстава «Паводле часу» адчынілася 27 кастрычніка ў вялікай зале Музея сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47).

Час — як не дзіўна для статычнага віду мастацтваў, якім з'яўляецца жывапіс і графіка, — асноўны стрыжань экспазіцыі. Гэта час чалавечы, касмічны, гістарычны і міфалагічны. Тэмы для натхнення Цімохаў знаходзіць у даўніх часах нацыянальнага паганства.

Сярод экспанаваных работ 1990–2000-х гадоў багата асобных і серыйных прац, прысвечаных загадкавым стодам і абярэгам, дрэвам-боствам, рытуальным яйкам і да таго падобным прадметам. Яны закручаны ў колазварот міфалагічнага часу трыма работамі, якія адбіваюць цыкл гадавога сонцавароту: «Гуканне вясны», «Купалле», «Каляды». Праўда, чамусьці нестае чацвёртай кропкі — восеньскага раўнадзенства, набліжанага да Дзядоў. Затое ёсць выхад у час гістарычны: цалкам удалая з пункту цяжкасці для вырашэння, актуальная тэма — «Грунвальд» (трыпціх 2010 г.).

Ад часу міфалагічнага і гістарычнага мастак з бездакорнай логікай экспазіцыі мастак пераходзіць да часу чалавечага ў графічных нізках «Постаці». Тэма ню вырашана з найвышэйшай дакладнасцю пачуццёвай і скупой лініі, якая паспрачаецца з вытанчанасцю графікі Пікасо. Такім чынам, можна канстатаваць вельмі спелы майстроўскі ўзровень як у валоданні прыёмамі малявання, так і ў тонкім адчуванні гармоніі колеру ў жывапісных творах.

Экспазіцыя, якая адчынена па 23 лістапада, не падмане спадзяванняў наведвальнікаў. Часам, ствараючы ажыятаж вакол «нашых эмігрантаў», публіка валам валіць на вернісажы твораў Ігара Цішына ці Барыса Заборава. Тым не менш наша мастацкая школа не выпадкова нарадзіла гэтыя персаналіі, бо яна багатая на іншыя імёны роўнавысокага ўзроўню, да якіх бясспрэчна належыць імя Сяргея Цімохава.



Сяргей Цімохаў перад сваім трыпціхам «Грунвальд» (2010)

**Сяргей ЦІМОХАЎ** нарадзіўся ў 1960 годзе ў вёсцы Кротаў Гомельскай вобласці. У 1979 годзе скончыў Мінскую мастацкую вучэльню, у 1984-м — Беларускую Акадэмію Мастацтва (кафедру манументальнага мастацтва). З 1986 па 1998 гады жыў у Полацку, затым пераехаў у Мінск. Сябра Беларускага саюза мастакоў з 1989 года. Працуе ў жанры станковага жывапісу і графікі, манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

# АСПЕКТЫ ЖЫЦЦЯ

**Адкрыццё выставы «Аспекты жыцця: рэльеф і скульптура з воўны» ў Музеі сучаснага мастацтва ў Мінску 2 лістапада адбывалася весела і тлумна.**

Матывы і вобразы касмічных сіл і спрадвечных вікінгаўскіх вобразаў шведскай мастачкі па тэкстылі Гунілы Пэтаў Шоберг на гэтай экспазіцыі, арганізаванай пры дапамозе Шведскай амбасады, адразу прывабілі багата гледачоў.

І так адбылося, што намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі і заслужаны мастак Васіль Шаранговіч пад ухвальныя рэплікі публікі заспрачаліся. Першы сцвярджаў, што ягоны дзед, таксама захоплены апрацоўкай воўны, быў лепшым шапавалам і майстрам па валёнках на Пастаўшчыне і Мядзельшчыне. Шаранговіч запярэчыў: маўляў, гэта ягоны дзед-каваль трымаў першынства ў ваколіцах Мядзела і па вырабу валёнак. Але, зазначыў ён, тое, што прадстаўлена на выставе, — гэта высокае і мадэрнае мастацтва, без якога, у адрозненне ад традыцыйнага абутку, немагчымае паўнацэннае эстэтычнае жыццё сучаснага чалавека.

Выстава сапраўды ўражвае багаццем тэм: ад скульптурных кампазіцый да ваўняных палотнаў і настольні тонкіх паверхняў з графічнымі матывамі, што яны нагадваюць пергамент. Асабліва ўлічваючы ўдалую густоўную падсветку экспанатаў. Невыпадкова намеснік старшыні Саюза мастакоў Беларусі Сяргей Цімохаў адзначыў не толькі гарманічную блізкасць твораў Гунілы Пэтаў Шоберг да яго ўласных «язычніцкіх» тэм у карцінах, што адначасова паказаны на яго выставе ў дольных залах музея. Ён таксама выказаў меркаванне, што эстэтычныя і стылёвыя пошукі шведкі акажуцца плённымі для фармулявання новых ідэй творцамі, што працуюць у розных відах і жанрах мастацтва.

Публіку — як заўсёды, на дасканалай беларускай мове — вітаў амбасадар Швецыі Стэфан Эрыксан, выказаўшы падзяку сям'і Шаранговічаў — быломý дырэктару Васілю, пры якім пачыналася супраца са шведскімі праектамі ў мінскіх музеях і ўласна адбылося знаёмства з Гунілай Пэтаў Шоберг. А таксама — яго дачцэ Наталлі, сённяшняй дырэктарцы. Шведская майстрыха была настолькі задаволеная якасцю экспанавання, што жартам паабяцала ўсе свае новыя выставы рабіць менавіта ў Беларусі.




«Аспекты жыцця» ў шведскай версіі можна агледзець па 14 лістапада. 6 лістапада Гуніла Пэтаў Шоберг прачытае лекцыю ў памяшканні галерэі «Акадэмія» Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (Сурганава, 14) з 10.00 да 14.00. Уваход вольны.

**Аляксей Хадыка**




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1114

Падпісана да друку 05.11.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.